№ 24 (574) 26 чэрвеня 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Аднолуеная ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі



## Місія кардынала Бэртонэ

Вялікае збліжэньне беларускіх уладаў з Ватыканам.

Старонка 3

## Ложак і аральны сэкс

прапануе пасажырам бізнэс–клясы авіякампанія «Раянэйр». Да чаго дайшоў прагрэс…

Старонка 6

## Русальле

Фатографы «НН» працягваюць падарожжы ў глуш, дзе захавалася тое, чаго больш нідзе не захавалася.

Старонка 8

У НУМАРЫ

**Эўра-2008**

вачыма нашага суайчыньніка. З Базэлю піша спэцыяліст-кампутарнік, двухразовы пераможца Кубку Яндэксу Ігар Маханёк, які цяпер працуе ў кампаніі Google у Швайцарыі. **Старонка 9.**

**«Ітэра» забудуе сталіцу Беларусі безь беларусаў**

Пабудова «Менск-Сіці» мае каштаваць $4,8 млрд. **Старонка 6.**

**Харонім «Белая Русь»**

Гісторык Алесь Белы абараніў у Літве дысэртацыю, якую яму зарэзалі ў Беларусі. **Старонка 10.**

**Прагулка па парку з пракурорам**

20 гадоў таму была адкрытая праўда пра Курапаты. Тады ж выйшлі на яву іншыя страшныя факты. Моманты гісторыі — **старонка 12.**

**У Беластоцкім унівэрсытэце зьнікне катэдра беларускай культуры**

На мінулым тыдні яе кіраўнік, прафэсар Яўген Мірановіч, абвясьціў супрацоўнікам, што яна будзе расфармавана. **Старонка 10.**

**Будслаў: што, дзе, калі**

1 ліпеня паломнікі з усёй краіны зьбяруцца на найвялікшы хрысьціянскі фэст. **Старонка 15.**

# Параліч волі

Два гады пазбаўленьня волі ўмоўна з выпрабавальным тэрмінам у тры гады для двух супрацоўнікаў ДАІ — вынік эпахальнага працэсу па справе «Жывога шчыту» ў Менску. Вялікі рэпартаж **Алеся Кудрыцкага**.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«Прапусьціце прэсу!» — настойліва патрабавала адвакатка Вера Страмкоўская, сьвідруючы сабе шлях праз натоўп на ганку суду Менскага раёну, што на Лагойскім тракце. «Нельга, поўная заля!» — матлялі галовамі расчырванелыя ад стрэсу ды задухі міліцыянты-ахоўнікі.**

**Працуючы ў гэтым судзе, яны бачылі не адзін працэс, які пачынаўся падобным чынам — але то былі палітычныя справы. Гэтым разам, аднак, на лаве падсудных апынуліся людзі ў пагонах (хоць і апранутыя «па гражданцы») — маёр Генадзь Дарагакупец і старшы лейтэнант Аляксей Ліхтаровіч, супрацоўнікі ДАІ Кастрычніцкага раёну сталіцы. Як сьцьвярджае абвінавачаньне, гэта яны выставілі 2 сакавіка «жывы шчыт» з аўтамабіляў з пасажырамі на трасе Менск — Мікашэвічы для таго, каб спыніць ашалелага ад гарэлкі Рамана Менцюка, які на сваім «Гольфе» ірваўся ў бок сталіцы на хуткасьці каля 160 км/г. Хоць яўнага палітычнага падтэксту працэс ня меў, але градус увагі да яго быў відавочна высокім — прычым ня толькі ў прэсе ды на інтэрнэт-форумах.**

**Старонка 4.**

# Працэс назіраньня пайшоў

Літаральна на наступны дзень пасьля прэс-канфэрэнцыі, дзе прадстаўнікі праваабарончых арганізацый краіны заявілі пра супольны маніторынг парлямэнцкіх выбараў, да іх прыйшлі падаткавікі. Загады Міністэрства па падатках і зборах пра неабходнасьць падаць дэклярацыі аб прыбытках і маёмасьці атрымалі кіраўнікі і актывісты ўсіх буйных праваабарончых арганізацый, а таксама іхныя сваякі.

Цягам апошніх дзесяці дзён лісты з падатковай інспэкцыі атрымалі старшыня Беларускага Хэльсынскага камітэту Алег Гулак, першы старшыня арганізацыі Тацяна Працька, віцэ-прэзыдэнт Міжнароднай фэдэрацыі правоў чалавека Алесь Бяляцкі, супрацоўнік БХК Зьміцер Маркушэўскі, праваабаронца Валянцін Стэфановіч, а таксама іхныя родныя.

Характэрна, што ўціск на праваабаронцаў пачаўся ў тыя самыя дні, калі Лукашэнкам быў падпісаны Указ №344 «Аб прызначэньні выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацьвертага скліканьня». Паводле гэтага дакумэнту парлямэнцкія выбары ў краіне пройдуць 28 верасьня.

Праваабаронца Валянцін Стэфановіч адзначае: «Усё гэта адбываецца на фоне вядомых рэпартажаў на БТ. На мой погляд, усё гэта робіцца для таго, каб загадзя дыскрэдытаваць тых людзей, што зьбіраюцца маніторыць выбары».

Стэфановіч кажа, што ўсе праваабаронцы, што атрымалі лісты зь Міністэрства, як добрапаслухмяныя грамадзяне, падалі дэклярацыі аб даходах і цяпер чакаюць адказу.

**Зьміцер Панкавец**

# Пра што дыялёг?

Адбылося паседжаньне падкамітэту па Беларусі Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы. У Страсбургу выступілі Лябедзька і Красуцкі.

Першым трымаў слова спэцдакладчык па Беларусі Андрэа Рыгоні. Ён прапанаваў да падпісаньня дэклярацыю з заклікам зьнізіць цану візаў для беларусаў.

Пасьля яго слова меў дэпутат палаты прадстаўнікоў Анатоль Красуцкі. Ён назваў сытуацыю ў адносінах Беларусі і ПАРЭ «ненармальнай». Беларускі бок зрабіў некалькі крокаў насустрач. «Шэраг асобаў, якім ПАРЭ надавала асаблівую ўвагу, выйшлі на свабоду», — заявіў ён. Ён акцэнтаваў увагу на эканамічных дасягненьнях краіны. Сказаў, што беспрацоўе ў Беларусі трымаецца на ўзроўні 1%, а інвэстыцыі ў сродкі вытворчасьці выраслі на 27%. Што да правоў чалавека, то ён заклікаў не дапусьціць, каб гэтае «паняцьце» стала «прадметам гандлю, спэкуляцыі ў барацьбе за ўладу».

Ён зьвінаваціў ПАРЭ ў тым, што ад Беларусі патрабуюць выканаць крытэры сяброўства для таго, каб распачаўся мінімальны дыялёг.

У выпадку пачатку глыбейшага дыялёгу, сказаў ён, ПАРЭ атрымае надзейнага партнёра ў пытаньні дэмакратызацыі — парлямэнт «зь ягоным 12-гадовым досьведам», сказаў ён.

Ён падрабязна расьпісаў увядзеньне нормы пра сяброў Цэнтравыбаркаму з дарадчым голасам.

Ці будзе крытыка канструктыўнай, будзе залежаць не ад нас, заявіў Красуцкі.

Ён прапанаваў, каб, як у 1999—2003 гадах, ПАРЭ накіроўвала запрашэньні палаце прадстаўнікоў, а яны прыяжджалі за свой кошт. «Я ўжо не гавару пра статус спэцыяльна запрошанага», — адзначыў ён. Супрацоўнік пасольства Беларусі ў Францыі Андрэй Сухарэнка ўважліва на яго паглядзеў.

Цікава, што Красуцкі ў кулюарах прызнаваўся, што ён адбыў свой апошні тэрмін у палаце прадстаўнікоў.

За ім выступаў Лябедзька.

Свой выступ ён пачаў з Закону пра СМІ. Чаму ён быў прыняты ў сьпешным парадку? — запытаўся ён.

АДС прапанавала зьмены ў Выбарчы кодэкс. Яны не былі нават разгледжаныя. Кандыдаты ня маюць доступу да СМІ, ня могуць нават сустракацца з выбарцамі, працягваў Лябедзька.

Рада Эўропа ня месца для гандлю, папярэджваў ён. АДС трэба ня 2, 3, 10 мандатаў, а свабодныя СМІ і ўключэньне прадстаўнікоў апазыцыі ў выбарчыя камісіі, а таксама магчымасьці кантролю назіральнікаў за падлікам галасоў.

Лябедзька падтрымаў узнаўленьне інстытуту парлямэнцкай «тройкі», у якую ўваходзілі прадстаўнікі ПАРЭ і Эўрапарлямэнту.

Што да сяброў Цэнтравыбаркаму з дарадчым голасам, то яны ня будуць мець ніякага ўплыву на прыняцьцё рашэньняў, зазначыў лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі.

У спрэчках выступілі таксама Тацяна Гацура з Хэльсынскага камітэту і зноў Рыгоні. Апошні нахвальваў перавагі дыялёгу. «Але пра што дыялёг? Што няможна чалавека садзіць за ўдзел у маніфэстацыі? Што галасы на выбарах трэба лічыць? Які дыялёг можа быць вакол гэтых пытаньняў?» — ня вытрымаў дэпутат ад Вугоршчыны.

На тым і разышліся.

Анатоль Лябедзька яшчэ перагаварыў з паслом Беларусі ў Францыі Паўлоўскім. Як невыязному, яму, пэўна, было пра што спытацца ў былога галоўнага памежніка краіны.

**Мікола Бугай, Страсбург**

# Купальле



Юлія Дарашкевіч

## КАЗУСЫ

# Яшчэ матч не пачаўся, а судзьдзя ўжо бегае

24 чэрвеня ў інтэрвію газэце «Комсомольская правда» Аляксандар Лукашэнка заявіў: «Мы хочам прадэманстраваць і Захаду, і Расеі, як трэба праводзіць выбары. Мы іх зробім настолькі дэмакратычнымі, што вы пераканаецеся ў рэальным выніку, каго сёньня падтрымлівае народ».

Ён адзначыў, што ў Беларусі ўжо працуюць першыя міжнародныя наглядальнікі, і ніхто ня будзе перашкаджаць іхнай рабоце пры ўмове, што яны ня будуць парушаць дзейныя ў Беларусі законы.

Вось такая яна, беларуская дэмакратыя. Выбарчая кампанія толькі стартавала 24 чэрвеня, у момант публікацыі інтэрвію, толькі ўказ аб выбарах падпісаны, а назіральнікі ўжо тут як тут, працуюць. Заўжды гатовыя, заўжды ў страі. Вось толькі хто яны, тыя назіральнікі? Зь якога аддзелу?

**Барыс Тумар**

## МЫ САМІ

### Просім усіх да аднаго

чытачоў «НН» даслаць у Палату прадстаўнікоў лісты пратэсту супраць прыняцьця Закону пра СМІ. Вопыт мінулых гадоў і аналягічных рэжымаў кажа, што такія кампаніі маюць вялікі сэнс.

Пісаць можна ад рукі або выдрукоўваць з кампутара. Зьмест лістоў можа быць адвольны. Абы толькі яны былі паважныя. Важна, каб прагучаў ясны пратэст супраць прынцыповых момантаў закону. Таму ў кожным лісьце просім напісаць прыкладна наступнае:

«Пратэстуем супраць прыняцьця новага Закону пра СМІ ў выглядзе, у якім ён прайшоў першае чытаньне. Пратэстуем супраць цынічнага патрабаваньня перарэгістрацыі СМІ пасьля прыняцьця Закону і пры кожнай зьмене адрасу. Пратэстуем супраць увядзеньня рэгістрацыі інтэрнэт-парталаў. Пратэстуем супраць перадачы функцый кантролю за СМІ раённым пракурорам і Савету міністраў. Ня можа быць устойлівага разьвіцьця краіны без свабоды СМІ, свабоды крытыкі. Просім адклікаць Закон».

**Лісты кіруйце на адрас:** вул. Чырвонаармейская, 4. 220016 Менск. Савет Рэспублікі Нацыянальнага Сходу

## СЬЦІСЛА

### У пажарным парадку

Закон пра СМІ быў прыняты ў другім чытаньні ўсяго праз тыдзень пасьля першага. Хоць большасьць законапраектаў ляжаць у нацыянальным сходзе доўгія месяцы. Тым ня менш, кампанія пратэсту супраць гэтага антыдэмакратычнага акту пачынае даваць эфэкт: ужо ў другім чытаньні дэпутаты вырашылі выключыць дурную норму пра неабходнасьць перарэгістрацыі СМІ пры кожнай зьмене юрыдычнага адрасу, а таксама шэраг драбнейшых пазыцый.

### На сьвятога ніколі

Як стала вядома, устаноўчы зьезд грамадзкага аб'яднаньня «Белая Русь» чарговы раз перанесены. Цяпер разглядаецца дата 25 кастрычніка. Першапачаткова зьезд аб'яднаньня мусіў адбыцца яшчэ 17 траўня, але быў перанесены з прычыны таго, што «ў рабочую групу па распрацоўцы праграмы «Белай Русі» паступіла шмат канкрэтных і абгрунтаваных прапановаў па яе дапрацоўцы». Відаць, аўтары ідэі «БР» выйшлі з фавору.

### Легалізацыя прастытуцыі немэтазгодная

Міністар унутраных справаў падкрэсьліў, што неабходна захаваць адказнасьць за гэты від правапарушэньняў. Легалізацыю прастытуцыі прапаноўвалі некаторыя дэпутаты.

### Гадзіна маўчаньня

Знак акцыі «Гадзіна маўчання» — чорны квадрат — зьявіўся на сайтах «Нашай Нівы», «Хартыі'97» і яшчэ некалькіх дзясятках інтэрнэт-рэсурсаў, адрасаваных беларускай аўдыторыі. Гэта Беларуская асацыяцыя журналістаў заклікала ўсіх 25 чэрвеня зьмясьціць на сваіх інтэрнэт-рэсурсах чорныя банэры ў знак пратэсту супраць прыняцьця Закону пра СМІ ў пажарным парадку ў другім чытаньні.

### Збой у нацыянальнай энэргасыстэме

У выніку спыненьня аднаго з генэратараў на Навалукамскай ДРЭС і ланцуговага эфэкту, які гэта выклікала, у некаторых раёнах Беларусі адключана электраэнэргія. Электрычнасьці няма ў некаторых населеных пунктах Віцебскай, Берасьцейскай, Гарадзенскай, Менскай абласьцей і некаторых раёнах Менску.

### 8 стобальных вынікаў па белмове!

Сталі вядомыя вынікі цэнтралізаванага тэставаньня па беларускай мове. Сёлета быў пастаўлены своеасаблівы рэкорд — 100 балаў атрымалі ажно 8 абітурыентаў. Летась такім вынікам маглі пахваліцца толькі трое. Яшчэ двое атрымалі 99 балаў, 15 чалавек — 98. Увогуле, 50 і больш тэставых балаў набралі каля 20% абітурыентаў.

### Партыя Мілошавіча выбрала саюз з дэмакратамі

Рэвалюцыя на сэрбскай палітычнай сцэне: Сацыялістычная партыя вырашыла ўвайсьці ва ўрадавую кааліцыю не з антызаходнімі Радыкаламі, а з праэўрапейскімі Дэмакратамі. Пра гэта 23 чэрвеня паведаміў лідэр сацыялістаў Іівіца Дачыч. Раней праваліліся перамовы сацыялістаў з Каштуніцам і Нікалічам, якія выступаюць за паглыбленьне сувязяў з Расеяй, а не ЭС.

**ЗП; МБ; СП**

# Місія кардынала Бэртонэ

Улады ўжылі новы прыём у палітыцы балянсаваньня між Захадам і Расеяй. Яны зрабілі шырокі жэст на адрас Ватыкану.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Кіраўнік Беларусі запрасіў Папу Бэнэдыкта XVI наведаць Беларусь зь візытам у любы зручны для яго час. Больш за тое, Беларусь і Касьцёл будуць рыхтавацца да падпісаньня Пагадненьне аб супрацоўніцтве. «Я ўпэўнены, што мітрапаліт Кандрусевіч будзе змагацца за незалежнасьць і сувэрэнітэт нашай дзяржавы», — заявіў Лукашэнка.

Цягам мінулага тыдня ў Беларусі зь пяцідзённым візытам на запрашэньне ўраду знаходзіўся Дзяржаўны сакратар Ватыкану Тарчызіё Бэртонэ. Гэта першы афіцыйны візыт такога высокага чыноўніка Ватыкану ў Беларусь. Дзяржсакратар Сьвятога Пасаду адпавядае прыкладна прэм'ерміністру ў сьвецкіх дзяржавах, таму і ў Нацыянальным аэрапорце кардынала сустракала ганаровая варта.

Зрэшты, Бэртонэ ўжо наведваў Беларусь у 1997 г., але тады ён яшчэ не знаходзіўся на пасадзе Дзяржсакратара.

«Я вельмі рады гэтаму візыту, вельмі рады такому сардэчнаму прыёму. Я прывёз пасланьне Папы Бэнэдыкта XVI», — сказаў адразу па прыезьдзе Тарчызіё Бэртонэ.

Натуральна, што найважнейшым пунктам праграмы кардынала была сустрэча з кіраўніком Беларусі, якая адбылася 20 чэрвеня. На сустрэчы з пасланьнікам Касьцёлу Лукашэнка адразу загаварыў пра палітыку. «Беларусь абсалютна ня супраць нармалізацыі дачыненьняў ня толькі з Эўропай, але і з ЗША, але мы нікому не дазволім умешвацца ў свае ўнутраныя справы», — цытуе Лукашэнку агенцтва БЕЛТА.

«Мы даўно супрацоўнічаем з Ватыканам, яшчэ з часоў Яна Паўла II, які вельмі любіў і паважаў Беларусь, гэта мне вядома. Калі ў выніку візыту Тарчызіё Бэртонэ дачыненьні Беларусі з Эўропай палепшацца, то мы гэта будзем толькі вітаць», — сказаў А.Лукашэнка.

Сам Бэртонэ на прэс-канфэрэнцыі гаварыў амаль ва ўнісон з А.Лукашэнкам. Кардынал заявіў пра непрымальнасьць санкцый. «Санкцыі супраць Кубы, супраць іншых краін, у тым ліку Беларусі, непрымальныя, бо ад іх церпіць народ», — падкрэсьліў Т.Бэртонэ.

Таксама Дзяржсакратар Ватыкану ўхваліў дзейсны ў Беларусі Закон аб свабодзе сумленьня. «Гэта добры Закон, які адлюстроўвае неабходнасьць абароны і павагі правоў пяці асноўных канфэсій, традыцыйных для Беларусі».

Галоўнай сэнсацыяй стала тое, што Аляксандар Лукашэнка запрасіў Папу Бэнэдыкта XVI наведаць Беларусь зь візытам у любы зручны для яго час.

Цікава, што беларускія тэлеканалы зрабілі зь візыту Тарчызіё Бэртонэ галоўную навіну тыдня. Пры гэтым кожны камэнтатар імкнуўся запытацца: калі ж адбудзецца гэты доўгачаканы візыт Папы? Яшчэ ў 2001 годзе, калі Ян Павал II наведваў Украіну, рыторыка дзяржаўных СМІ была зусім іншай.

Праўда, гаварыць пра нейкія тэрміны візыту Бэнэдыкта XVI у Беларусь пакуль несвоечасова. Хаця Бэртонэ і кажа: «Я не магу вызначыць час, але мы будзем спадзявацца на візыт папы ў Беларусь».

Лукашэнка таксама падкрэсьліў, што ў яго наладзіліся вельмі добрыя асабістыя стасункі з кіраўніцтвам Рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі: «Я вітаў вяртаньне Тадэвуша Кандрусевіча, Архібіскупа Мітрапаліта Менска-Магілёўскага, на родную зямлю. Ён сапраўдны патрыёт сваёй краіны і з разуменьнем ставіцца да тых працэсаў, якія адбываюцца ў Беларусі. Я ўпэўнены, што ён будзе змагацца за незалежнасьць і сувэрэнітэт нашай дзяржавы, а дзяржава будзе яму надзейнай апорай у гэтым». Лукашэнка паабяцаў каталікам дазволы на будаўніцтва новых касьцёлаў і ўсялякую падтрымку.

І яшчэ адно важнае пытаньне: падпісаньне Беларусьсю канкардату з Ватыканам, які замацуе прававыя нормы адносін дзяржаваў у самых розных пытаньнях. Прынцыповая дамова была дасягнутая, калі канкардат урэшце будзе падпісаны, то гэта відавочна ўмацуе пазыцыі Касьцёлу ў Беларусі. З усіх постсавецкіх краін падобнае пагадненьне з Ватыканам мае толькі Літва.

Тарчызіё Бэртонэ меў падкрэсьлена насычаны візыт. Штодзень у кардынала было па некалькі сустрэчаў і мерапрыемстваў. Так, скажам, ён пасьпеў пабываць ва ўсіх беларускіх дыяцэзіях, сустрэцца з грэка-каталікамі, а таксама наведваць у Бараўлянах дзетак, хворых на рак.

Апроч Лукашэнкі, Бэртонэ меў сустрэчу зь міністрамі замежных справаў Сяргеем Мартынавым і ўпаўнаважаным у справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Леанідам Гулякам. Мартынаў падарыў Бэртонэ (вялікаму футбольнаму заўзятару) майку зборнай Беларусі з нумарам «12» (які сымбалізуе месяц нараджэньня кардынала — сьнежань) і надпісам «Bertone».

Адбылася сустрэча Тарчызіё Бэртонэ і з кіраўніком Беларускай праваслаўнай царквы мітрапалітам Філарэтам.

У суботу кардынал спаткаўся з моладзьдзю і асьвяціў нарожны камень пад касьцёл Сьвятога Яна Хрысьціцеля ў Серабранцы. А ў нядзелю, апошні дзень візыту, Тарчызіё Бэртонэ наведаў Чырвоны касьцёл, усклаў кветкі на плошчы Перамогі і адслужыў урачыстую імшу ў катэдры, ля якой сабраліся шэсьць тысяч чалавек.

Вось такім атрымаўся візыт кардынала Бэртонэ. Наступствы якога беларускія каталікі, пэўна, што яшчэ адчуюць.

**Зьміцер Панкавец**

# Самыя крымінальныя — раёны Магілёўшчыны

Генпракурор **Рыгор Васілевіч** даў першую прэс-канфэрэнцыю ад моманту прызначэньня яго на гэтую пасаду ў лютым.

Варта адзначыць, што пракурорскі мундзір Васілевіч прыйшоўся ўпару. Былы старшыня Канстытуцыйнага суду свабода апэрыруе статыстыкай без дапамогі шпаргалак, прыводзіць канкрэтныя прыклады злачынстваў і пакараньняў, а таксама прызнаецца, што працуе па 12 гадзін у суткі.

Васілевіч паведаміў, што за пяць першых месяцаў сёлета было зьдзейсьнена 67 тысяч злачынстваў, што амаль на 7% ніжэй, чым такі ж прамежак летась. Разам з тым, на 15% вырасла колькасьць злачынстваў, зьвязаных з карупцыяй: хабары, злоўжываньні службовымі паўнамоцтвамі.

Новы генпракурор працягвае гаварыць пра гуманізацыю заканадаўства. «Пазбаўленьне волі ня ёсьць панацэяй для прадухіленьня злачынстваў», — перакананы Р.Васілевіч. Ён прапаноўвае больш шырока ўжываць папраўчыя і грамадзкія працы. Прычым, ня проста падмятаньне вуліц, а больш «запамінальныя» пакараньні. На сёньня 26% судовых працэсаў канчаецца турмой для абвінавачанага.

Ёсьць у плянах і спыненьне крымінальных справаў пры прымірэньні бакоў. Раней гэта было магчыма толькі па справах, дзе прадугледжвалася адказнасьць ня больш за два гады турмы, цяпер гавораць пра шэсьць.

Летась у краіне было зафіксавана 791 забойства. Дарэчы, у прапорцыях насельніцтва забойстваў у вёсцы фіксуецца ў два разы больш, чым у горадзе. Самымі крымінальнымі раёнамі ў краіне зьяўляюцца Магілёўскі, Бабруйскі, а таксама Партызанскі раён Менску. Кожны пяты зафіксаваны крадзеж прыпадае на мабільныя тэлефоны.

Васілевіч наракае на тое, што ў краіне амаль ніколі не аналізаваліся апраўдальныя прысуды. Ён прывёў прыклад, як за аналягічнае парушэньне суд вынес абвінаваўчы вырак у Магілёўскай вобласьці і апраўдальны ў Менскай.

Запыталіся ў генэральнага пракурора і пра гучную справу стваральнікаў «Мультклюбу». Рыгор Васілевіч шчыра прызнаўся, што ня ведае, ці спынілі яе. Мульцікі гэтыя Васілевіч таксама не глядзеў.

«Ня толькі Анатоль Лябедзька абмежаваны ў сваім выезьдзе за мяжу. Калі ёсьць нейкія парушэньні, запазычанасьці, то ўсё гэта правамерна», — так Васілевіч выказаўся па крымінальнай справе лідэра АГП, сьледзтва па якой вядзецца на працягу некалькіх гадоў.

«Вось Рамана Менцюка вырашылі не затрымліваць, цяпер МУС яго шукае. Яго, можа, і ня варта было затрымліваць з улікам цяжкасьці злачынства, але чалавек быў ужо раней судзімы. Трэба было хаця б яго кантраляваць», — сказаў Васілевіч пра справу «жывога шчыта».

**ЗП**

# Рэгіёны салідарызуюцца зь Міхалевічам

Шанцы на ўзнаўленьне Алеся Міхалевіча ў партыі БНФ узрастаюць. Цягам тыдня пра сваю салідарнасьць зь Міхалевічам заявілі амаль усе рэгіянальныя структуры партыі.

Першымі ў абарону былога намесьніка старшыні партыі стала Берасьцейская абласная рада БНФ. Пасьля былі заявы Гарадзенскай гарадзкой арганізацыі, а таксама абласных структур Магілёўшчыны і Віцебшчыны.

«Выключэньне Міхалевіча паказвае адсутнасьць жаданьня кіраўніцтва БНФ ісьці на кампраміс, што не вырашае праблемы еднасьці ўнутры партыі. Мы лічым, што сёньня сп.Алесь Міхалевіч ёсьць адным з найбольш пасьпяховых партыйных кіраўнікоў. Патрабуем ад Сойму БНФ адмены прынятага рашэньня аб выключэньні Міхалевіча з шэрагаў партыі, а таксама ўзнаўленьня яго на пасадзе намесьніка старшыні», — гаворыцца ў заяве Віцебскай абласной рады.

На Меншчыне галасы ўдзельнікаў рады падзяліліся папалам — чатыры чалавекі выступілі ў абарону Міхалевіча, чатыры — супраць, яшчэ два ўстрымаліся.

У суботу таксама зьбіралася Гомельская абласная рада БНФ і прыняла рашэньне патрабаваць ад кіраўніцтва партыі доказаў таго, што Міхалевіч нешта парушыў.

Сам Алесь Міхалевіч пакуль ня робіць рэзкіх крокаў і заявіў, чакаючы зьмены сытуацыі.

**ЗП**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Падсудныя Генадзь Дарагакупец (зьлева) і Аляксей Ліхтаровіч.

# Параліч волі

### Натоўп на ганку

Прайсьці ў суд прэсе заміналі ня толькі міліцыянты, але і мужчыны ў штацкім з шырокімі сьпінамі. Як выявілася пазьней, гэта былі калегі падсудных. І менавіта яны чароўным чынам запоўнілі залю яшчэ да таго, як дзьверы суду расчыніліся для наведнікаў гэтага адкрытага працэсу.

Так ці іначай, пасьля невялікага скандалу, пішучым журналістам дазволілі заняць месцы ў залі. Праўда, тэлеапэратараў ды фотакораў на суд не дапусьцілі, таму яны былі вымушаныя задаволіцца, узяўшы ў прыцэл аб'ектываў пяцёх пасажыраў «жывога шчыту», якія прыехалі выступаць у судзе ў якасьці пацярпелых. Шостую пасажырку, маленькую Валерыю Пашкевіч, бацькі пакінулі ўдома на дагляд родных.

Пацярпелыя, звыклыя да ўвагі прэсы, паводзілі сябе спакойна, хоць і крыху напружана. Ня дзіва: колькі сілаў было пакладзена на тое, каб давесьці справу да суду. Юры Пашкевіч, кіроўца «БМВ», які прыняў на сябе галоўны ўдар менцюкоўскага «Гольфу», быў апрануты ў бездакорна адпрасаваны аліўкавы гарнітур.

Побач зь ім трымалася жонка, хударлявая жанчына інтэлігентнага выгляду, з кароткай фрызурай ды ў акулярах.

Іншы герой інцыдэнту на шашы, Аляксей Берасьнеў, які пасьля аварыі, мацюкаючыся на міліцыянтаў, дапамагаў даставаць зь легкавікоў пацярпелых, стаяў, засунуўшы рукі ў кішэні джынсаў. Разам зь Берасьневым у працэсе ўдзельнічае ягоны сябрук Канстанцін Белагубцаў, які быў за рулём «Хонды» ў той вечар.

Кабета ў чорным строі — Алена Каўпакова, чый джып «Таёта» атрымаў першы ўдар «Гольфу» па датычнай. Мяркучы па заплаканых вачах ды зьнэрваванай паставе, жанчына дагэтуль не аправілася ад стрэсу.

### Не пачвары

Невялікі судовы кабінэт з парэпанай стольлю і цеснымі драўлянымі лавамі здолеў зьмясьціць ня больш за тры тузіны чалавек, напакаваных локаць да локця. Увішны тэлеапэратар падбег да расчыненага акна, паставіў камэру на штатыў ды пачаў нахабна здымаць залю проста з вуліцы, праз краты. «Досыць!» раздражнёна адагнала яго судзьдзя Ірына Майко, не забыўшыся, аднак, незаўважна паправіць пасмачку бялявых валасоў.

На просьбу адвакаткі пацярпелых Веры Страмкоўскай пусьціць у залю рэшту журналістаў судзьдзя адмовіла: «Дзе яны разьмесьцяцца? Вольнай засталася толькі клетка. Больш аніводнага квадратнага мэтра няма».

Нарэшце, суд распачаўся. Той, хто чакаў пабачыць на лаве падсудных цынічных монстраў, мусіў расчаравацца. Абвінавачаныя выявіліся звычайнымі беларускімі мужыкамі, разгубленымі, прыбітымі невясёлымі думкамі. Абодва паводзілі сябе ціхмяна, калі не сказаць, адчувалі сябе прыгаломшанымі.

Мажны, старэйшы і па званьні і па ўзросьце Генадзь Дарагакупец нерухома сядзеў на лаве, ніби скошаны набок валун, панура паклаўшы локці на калені ды счапіўшы пальцы ў замок. Уздымаючыся час ад часу для адказу на пытаньні, ён, ссутулены, выразна «чэкаў» (ён родам зь вёсцы на Берасьцейшчыне), даючы свае непшматслоўныя адказы (словы заставалі комам у горле). Часам здавалася, што маёр знаходзіцца ў напаўсьне, успрымае тое, што адбываецца навокал, як нейкае трызьненьне.

Зразумець ягоныя эмоцыі нескладана: паводле часткі першай артыкулу 426 Крымінальнага кодэксу Дарагакупцу ды ягонаму напарніку Ліхтаровічу пагражае да трох год турмы. Акрамя гэтага, кожны з шасьці пацярпелых запатрабаваў кампэнсацыі маральнай шкоды памерам 50 мільёнаў рублёў, дый матэрыяльнай шкоды патрабуюць вярнуць больш чым на 3 мільёны... Колькі гэта — амаль паўтары сотні тысячаў даляраў на брата? За ўсё жыцьцё ня выплаціш, тым больш, што заробку няма ўжо месяц — кіраўніцтва ДАІ, якое сьпярша апраўдвала дзеяньні экіпажу, зьмяніла сваё стаўленьне ды адхіліла маёра ад пасады. Праз 15 год службы — такі ганебны канец кар'еры... А дома — жонка, шаснаццацігадовы сын, якога трэба выводзіць у людзі, ды дзевяцігадовая дачка...

Аляксей Ліхтаровіч (таксама не мянчук — родам з Валожыншчыны, гадоў трыццаці, невысокі, але з моцнай сківіцай) трымаўся крыху менш напружана: як падначалены Дарагакупца, ён, відавочна, ня траціў надзеі атрымаць мякчэйшае пакараньне. Большасьць часу ягоныя вусны расьцягваліся ў бляклай ніякаватай ўсьмешцы, але вочы выдавалі разгубленасьць, ды галава часам змучана падала на грудзі, агаляючы загарэлы карак.

### Вэрсія пацярпелых

Першы дзень распачаўся з допыту ўдзельнікаў здарэньня — пацярпелых ды абвінавачаных. Выступаючы па чарзе, усе пяцёра пасажыраў злашчасных аўто апісалі, кожны са сваёй пэрспэктывы, цалкам ідэнтычную карціну. Вартых увагі супярэчнасьцяў у іх паказаньнях не заўважалася. Такім чынам, паводле абагульненай вэрсіі пацярпелых, увечары 2 сакавіка іх аўтамабілі, адзін за адным, былі спыненыя супрацоўнікамі ДАІ на шашы «Мікашэвічы—Менск» на ўезьдзе ў горад. Інспэктар даваў жэстам сігнал спыніцца, скіроўваючы аўтамабілі такім чынам, каб тыя занялі ўсе чатыры палосы руху. Спробы кіроўцаў выйсьці з машыны спыняліся. Праз непрацяглы час ззаду наляцеў «Гольф», зачапіў «Таёту» Алены Каўпаковай і ўдарыў па «БМВ», у якім знаходзілася сям'я Пашкевічаў. Па інэрцыі аўтамабіль урэзаўся ў міліцэйскае аўто, якое, у сваю чаргу, зачапіла іншы легкавік ДАІ.

Пасьля аварыі ўсе ўдзельнікі знаходзіліся ў стане шоку. «Мяне ўспрынялі ня як чалавека, а як кавалак мяса», — абурана заявіў Канстанцін Белагубцаў. Як сьцьвярджаюць пацярпелыя, у гармідары пасьля сутыкненьня супрацоўнікі ДАІ праявілі разгубленасьць, хоць, крыху ачомаўшыся, таксама пачалі выцягваць пацярпелых з разьбітых машы-



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Пацярпелыя ля ганку суду.

наў. І ўсё роўна ў выніку сям'ю Пашкевічаў адвезьлі дадому знаёмыя, а за эвакуатар давялося плаціць з уласнай кішэні. Алена Каўпакова ехала праз увесь горад у сваім напаўразьбітым джыпе — ніхто з супрацоўнікаў ДАІ, якія да гэтага часу ў лішку пазьяжджаліся да месца аварыі, нават не пацікавіўся, як яна дабярэцца да хаты ў такім стане і на такой машыне.

## «Сёньня я кажу праўду»

А вось абвінавачаныя намалявалі на судзе іншую карціну. Зрэшты, яна радыкальна адрозьнівалася ня толькі ад сьведчаньняў пацярпелых, але і ад уласных паказаньняў Дарагакупца ды Ліхтаровіча, якія тыя давалі ў часе папярэдняга сьледзтва, непасрэдна пасьля аварыі.

Гэтак, на папярэднім сьледзтве яны казалі, што зусім ня мелі часу на развагі ды дзеяньні — маўляў, ад моманту іхнага прыезду на месца здарэньня да аварыі прайшлі лічаныя сэкунды. Напрыклад, Генадзь Дарагакупец казаў на папярэднім сьледзтве пра 5 сэкундаў, якія прайшлі да аварыі, а вось на судзе ўжо вёў гаворку пра цэлых 30 сэкундаў. Адкуль такая нестыкоўка? «Я ад першасных паказаньняў адмаўляюся», — толькі і сказаў маёр.

Больш за тое: у часе папярэдняга сьледзтва Ліхтаровіч заявіў, што рабіў знак кіроўцам не спыняцца, а ехаць далей (менавіта такую вэрсію спачатку агучыла было кіраўніцтва ДАІ). Але на судзе, зьвязаны падпіскай пра крымінальную адказнасьць за дачу непраўдзівых паказаньняў, Ліхтаровіч прызнаў-такі, што ён даваў машынам знак спыняцца.

Увогуле, і Ліхтаровіч, і Дарагакупец часта папраўляліся, мянялі свае высновы, не маглі вызначыцца з фармулёўкамі. Так ці інакш, і ляйтматыў довадаў Дарагакупца і Ліхтаровіча быў такі: яны фізычна не маглі нічога зрабіць, каб прадухіліць сутыкненьне — бракавала часу.

І адвакат, і судзьдзя патрацілі нямала высілкаў на тое, каб агучыць усе зафіксаваныя ў справе супярэчнасьці ў паказаньнях даішнікаў, паставіўшы іх перад пытаньнем: дык калі ж тыя гавораць праўду? «Сёньня я кажу праўду», — так і заявіў Ліхтаровіч. Але чаму ён не рабіў гэтага на папярэднім сьледзтве? Ясная адказу на гэтае пытаньне ён ня даў, але ў нейкі момант заікнуўся быў пра тое, што на яго, нібыта, ціснуў сьледчы. Але Ліхтаровіч тут жа наступіў сабе на язык і адмовіўся ад гэтых сваіх словаў. «А што ты яшчэ зробіш, калі я...ы зацісьнуць ды рукі выкруцяць», — ціха сыкнуў адзін зь ягоных калегаў у залі.

## Кажуць сьведкі

Сьведкі — супрацоўнікі ДАІ зь іншага экіпажу, які прыбыў на месца здарэньня зь Менску, і слуцкае ДАІ, якое перасьледвала «Гольф» Менцюка, — таксама давалі расплывістыя паказаньні. Адвакатка да судзьдзя рэгулярна знаходзілі ў іхніх словах неадпаведнасьці. Адзін са сведак тлумачыў недакладнасьці тым, што ён быў пасьля аварыі ў шоку, рукі калаціліся. Цікава, што прысутныя ў залі калегі абвінавачаных адрэагавалі на гэтыя словы супрацоўніка ДАІ сур'ёзна, хоць незадоўга да гэтага яны адкрыта высьмейвалі Алену Каўпакову, якая распавядала пра свае візыты да псыхатэрапэўта пасьля аварыі.

## «БМВ»-фантом

І абвінавачаныя, і сьведкі з ДАІ ўсе як адзін сьцьвярджалі, што на палосах было толькі тры машыны, а першую займала міліцэйскае аўто. Пацярпелыя, аднак, казалі, што была і чацьвертая машына — чорная «БМВ». Куды яна падзелася, і ці была яна на месцы аварыі?

Паводле словаў абвінавачаных (і гэта пацьвярджаецца запісам радыёперамоваў), апэратыўны дзяжурны Антаневіч даў ім загад «прытрымаць рух» на гэтым адрэзку дарогі. «Так, мы створым вам затор — адказаў праз нейкі час па рацыі Ліхтаровіч.

Які сэнс укладаў ён у гэтыя словы? Ліхтаровіч патлумачыў пракурору так: «Я прыняў загад даслоўна: прытрымаць рух. Што такое прытрымаць рух? Гэта значыцца, пярэдняя аўтамашына спыніць, сабраць шчыльную плынь транспарту, і, калі шчыльная плынь зьбярэцца, сказаць, каб яны павольна рухаліся».

Такім чынам, Ліхтаровіч і Дарагакупец спрабавалі стварыць паласу павольнага руху, у якой Мянцюк мусіў са сваім «Гольфам» завязнуць, як у багне. Але ці была рэальнай такая задума?

«А як вы зьбіраліся затор ствараць? — запыталася Вера Страмкоўская ў Ліхтаровіча. — Якія аб'ектыўныя дадзеныя былі да таго, што вы адказалі: «Мы вам створым «затор?»

«Аб'ектыўныя дадзеныя — загад апэратыўнага дзяжурнага, — адказаў Ліхтаровіч. — Калі я адказваў, я на дарогу яшчэ не зьвяртаў увагі». — «А на падставе чаго вы даяце такі адказ?» — «На падставе загаду апэратыўнага дзяжурнага». — «Загад што, любой цаной вы павінны выконваць? Ці ацэньваючы сытуацыю?» — «Ацэньваючы сытуацыю». — «Ацанілі вы да гэтага часу сытуацыю ці не? Адкажыце!» — «Напэўна, не...» — апусьціў рукі Ліхтаровіч. А тут яшчэ і Генадзь Дарагакупец вызнаў перад пракурорам, што на трасе не ставала машын для стварэньня мабільнага затору...

Цікава, што паводле агучаных у судзе мэтадычных рэкамэндацыяў Дарожна-патрульнай службы, тэхніка стварэньня мабільных затораў павінна быць іншай. Па-першае, для таго, каб стварыць «мабільны заслон» (штучны транспартны затор) для той шырыні дарогі, якая была на месцы аварыі на трасе Менск—Мікашэвічы, трэба было мець як найменш чатыры аўтамабілі апэратыўнага прызначэньня. Спачатку іх трэба паставіць уздоўж канту дарогі і свабодна прапускаць транспарт. Калі парушальнік, якога трэба затрымаць, наблізіцца, машыны ДАІ мусяць па чарзе ўліцца ў транспартную плынь з уключанай сыгналізацыяй, займаючы ўсе палосы руху і паступова запавольваць хуткасьць усёй аўтамабільнай плыні ажно да яе спыненьня.

Чаму Ліхтаровіч ды Дарагакупец стваралі затор паводле іншага рэцэпту? Ці раіліся яны з кімсьці наконт таго, як рабіць той «затор»? Як апэратыўны дзяжурны прыйшоў да высновы, што трэба аддаць загад «запаволіць рух» — сам, ці яму таксама далі загад? Адказы на гэтыя пытаньні знайсьці так і не ўдалося. Абвінавачаныя адмоўчаваліся, а сам апэратыўны дзяжурны Антаненка (яго зьбіраліся выклікаць у якасьці сьведкі) па дзіўным супадзеньні сышоў у адпачынак за дзень да пачатку суду ды зьехаў за межы Беларусі, адключыўшы тэлефон.

## Як спыняць па правілах?

Дарэчы, якія ўвогуле існуюць правілы для спыненьня парушальніка? Узгаданыя вышэй рэкамэндацыі у якасьці першага сродку раяць скарыстацца (з дазволу апэратыўнага дзяжурнага ці, у крытычнай сытуацыі — самастойна) адмысловымі шыпамі ці калючым ланцугом «Дыяна», які сьцелецца па дарозе перад парушальнікам. Як сьцьвярджаў Дарагакупец, у іх машыне была тая «Дыяна», але скарыстацца ёй не было загаду. Дый не пасьпелі б. Акрамя гэтага, для яе выкарыстаньня трэба быць упэўненым, што ў аўтамабілі, які трэба спыніць, знаходзяцца толькі датычныя да злачынства людзі.

Чытаем інструкцыю далей. Наступны спосаб спыніць «гоншчыка» — перагарадзіць дарогу грузавікамі, папярэдне вывеўшы адтуль кіроўцаў. Пра выстаўленьне легкавых аўтамабіляў ніякай згадкі няма. Трэці спосаб, які лічыцца найбольш гнуткім ды бясьпечным — стварэньне мабільнага затору. Менавіта ім, з словаў абвінавачаных, яны і спрабавалі скарыстацца.

Цікавая акалічнасьць: тая самая інструкцыя кажа, што, калі іншымі спосабамі папярэдзіць аварыю нельга, дазваляецца перагарадзіць дарогу аўтамабілямі апэратыўнага прызначэньня — як самая апошняя магчымасьць. Чаму Дарагакупец ды Ліхтаровіч не спынілі Менцюка сваёй машынай? Адказ на гэтае пытаньне таксама цікавіў і пракурора. Маёр Дарагакупец адказаў яму, што не заўважыў іншай машыны ДАІ, якая ехала ззаду ім на дапамогу (бадай, ён меў на ўвазе, што даўжыні адной ягонай машыны не хапіла б, каб цалкам перакрыць праезную частку). Чаму ж даішнікі хаця б не паставілі на дарозе сваю машыну з уключанай мігалкай, каб сустрэчныя машыны сышлі, паводле правілаў, на крайнюю правую паласу? «Але яны гэтага не зрабілі...» — разгублена адказаў маёр. Тут, дарэчы, робіцца зразумелым, чаму на судзе абвінавачаныя і сьведкі з боку ДАІ так актыўна пераконвалі суд, што мігалкі ўсё-такі былі ўключаныя ў момант аварыі.

## Вырак

Вынесены вырак збольшага адпавядаў даволі мяккаму запросу пракурора. Суд прызнаў Дарагакупца ды Ліхтаровіча вінаватымі, прызначыўшы ім пакараньне ў выглядзе двух год зьняволеньня ўмоўна з выпрабавальным тэрмінам на тры гады. Таксама цягам трох год яны ня будуць мець права займаць пасады начальнікаў у ворганах унутраных справаў. Дарагакупец ды Ліхтаровіч мусяць таксама часткова кампэнсаваць палову выдаткаў пацярпелых на адваката, а таксама судовыя выдаткі — такім чынам, кожны мусіць сплаціць каля мільёна рублёў. А вось у зыску аб кампэнсацыі маральнай ды матэрыяльнай шкоды да Дарагакупца ды Ліхтаровіча пацярпелым было адмоўлена. Маральную шкоду пацярпелым будуць сплочваць не інспэктары, а гарадзкая ўправа ўнутраных справаў Менгарвыканкаму. Юры Пашкевіч, яго жонка і дачка атрымаюць па 6 мільёнаў рублёў, Алена Каўпакова 2 мільёны, Аляксей Берасьнеў ды Канстанцін Белагубцаў па 1 мільёну. Прыгавор атрымае законную сілу праз дзесяць дзён, калі ня будзе абскарджаны.

## Высновы

Суд па «Жывым шчыце» агаліў і многія іншыя праблемы. Па-першае, уражвала татальнае няведаньне прысутнымі ў судзе супрацоўнікамі ДАІ службовых інструкцыяў — і судзьдзя, і пракурор, і адвакатка пацярпелых неадназова пыталася ў абвінавачаных ды сьведкаў пра зьмест інструкцыяў, якімі яны мусяць карыстацца, а тыя ў адказ часьцяком «плавалі», нібы першакурсьнікі на экзамэне.

Па-другое, як паказаў запіс радыёперамоваў, 2 сакавіка дзяжурны ДАІ Менскай вобласьці паведаміў, што ўсе машыны ДПС занятыя на «спэцмерапрыемстве». Менавіта таму так доўга не ўдавалася даслаць дапамогу слуцкаму экіпажу, які перасьледаваў Менцюка. Што гэта было за «спэцмерапрыемства»?

А яшчэ на судзе выявілася, што, паводле службовых інструкцыяў, аўтамабіль ДАІ фактычна разглядаецца як сьвятарная карова, ставіць якую ў небясьпеку можна ў выключным выпадку.

У сваім заключным слове адвакатка пацярпелых Вера Страмкоўская сказала: «Назаўжды ў гісторыю Беларусі і беларускай юстыцыі ўвойдзе паняткак «жывы шчыт». Аднак хочацца верыць, што гэты фэнамэн увойдзе менавіта ў гісторыю, а ня зробіцца звычайнай зьявай. У судзе ўвесь час вісела атмасфэра недавыказанасьці. Так і не атрымалася высьвятліць, у якіх нетрах нарадзілася рашэньне стварыць мабільны затор, і як яно абмяркоўвалася. Абвінавачаныя ды сьведкі з боку ДАІ маўчалі пра тое як рыбы. Камэнтуючы гэта, адвакат абвінавачаных ў заключным слове дазволіў сабе загадкавую фразу: «Калі яны не адказвалі, значыцца на тое ў іх былі падставы. Я думаю, усе здагадваюцца, якія гэта прычыны, пра якія ніхто ня хоча казаць, і ня будзе казаць».

Заключныя словы Дарагакупца ды Ліхтаровіча былі дужа кароткімі. Абодва шчыра шкадавалі пра тое, што здарылася: «Нічога наўмыснага мы ня зьдзейсьнілі». Ліхтаровіч сказаў, што пацярпелыя зрабіліся закладнікамі сытуацыі. Але не пакідае ўражаньне, што закладнікамі сытуацыі зрабіліся і самі інспэктары ДАІ, на якіх слова «загад» мае такі магутны ўплыў, што здольнае паралізаваць іхную волю і здольнасьць цьвяроза ацэньваць сытуацыю. Як гэта часта здараецца ў Беларусі, капнуўшы праблему глыбей, абавязкова дастанеш на белы сьвет трухлявыя чарапкі несвабоды.

**Алесь Кудрыцкі**





МАЛЮНКІ АЛЕСЯ КУДРЫЦКАГА

### Парады па сьлядах «Жывога шчыту»

**Страхоўка**

Як выявілася на судзе, усе пацярпелыя маюць пэрманэнтныя праблемы з атрыманьнем страхавых унёскаў за разьбітыя аўто. Сям'я Пашкевічаў дагэтуль не атрымала ані рубля ад страхавой фірмы, а Каўпакова здолела толькі часткова (атрымала 4 мільёны рублёў замест 5) вырваць са страхавой кампаніі выдаткі на рамонт машыны — ды і тое таму, што мела дужа дарагую страхоўку «Аўтакаска». Парада: дбайце пра надзейную страхоўку загадзя.

**Маральная шкода**

Здавалася б, маральная шкода пацярпелым навідавоку. Але судовая мэдычная экспэртыза палічыла, што ўсе ўдзельнікі, нават маленькая Валерыя Пашкевіч, якая не магла ўначы спаць пасьля аварыі, ані кроплі не пацярпелі ў псыхалягічным пляне. Толькі Алена Каўпакова наблізілася да таго, каб яе маральныя пакуты былі афіцыйна зарэгістраваныя. Чуйная жанчына, яна пасьля аварыі знаходзілася ў такім стрэсе, што на наступны дзень мусіла пайсьці ў платны мэдычны цэнтар да псыхатэрапэўта. «Мне патрэбна было хаця б каму-небудзь выплакацца», — патлумачыла яна на судзе. Потым быў яшчэ адзін візыт да псыхатэрапэўта, выпісаныя заспакаяльныя лекі ды прызначаная паўторная кансультацыя. Дык вось, сьледчая мэдэкспэртыза палічыла тое, што Каўпакова не прыйшла на тую паўторную кансультацыю як знак таго, што псыхалягічная дапамога не была ёй патрэбная! Такім чынам, калі вы патрапілі ў экстрэмальную сытуацыю і жадаеце давесьці, што атрымалі маральную ды псыхалягічную шкоду, зьвяртайцеся да псыхатэрапэўта, захоўвайце чэкі ды праходзьце прызначаны курс лекаваньня цалкам. Бяз гэтага шанцы на посьпех у вас мінімальныя.

**Здымка мабільнікам**

На судзе дужа сур'ёзна прымаліся да разгляду ў якасьці доказаў здымкі і відэа, зробленыя мабільным тэлефонам. Таму, патрапіўшы ў складаную і неадназначную сытуацыю, варта як мага больш дакладна зафіксаваць здарэньне. Мае сэнс таксама зьвярнуць увагу на ўсіх прысутных людзей, узяць іх каардынаты. Запомніце ці сфатаграфаваць нумары ўсіх аўтамабіляў, якія апынуліся побач. А таксама запісаць па гарачых сьлядах тое, што вы бачылі, — каб памяць не згуляла з вамі злы жарт праз пару месяцаў.

**Алесь Кудрыцкі**

# «Ітэра» забудуе сталіцу Беларусі безь беларусаў

Пабудова «Менск–Сіці» мае каштаваць $4,8 млрд.



Бізнэс-цэнтар паміж вуліцамі М.Танка і Кальварыйскай будзе складацца з 30-павярховага жылога дому і двух будынкаў вышынёй 43 і 54 паверхі.

Міжнародная група кампаніяў «Ітэра» забудуе цэнтар беларускай сталіцы разам з маскоўскімі калегамі ГК СУ-155 (доля ў праекце —15%) і «Внуково-Инвест» (5%).

На месцы аэрапорту «Менск-1» паўстане дзелавы цэнтар «Менск-Сіці», які абыдзецца інвэстару ў $4,8 млрд. Паводле плянаў да 2020 г. на плошчы 318 га маюць пабудаваць мінігорад з насельніцтвам 55—60 тыс. чалавек, паведаміў у інтэрвію газэце «Белорусы и рынок» гендырэктар СТАА «Менск-Сіці» Сяргей Кісялёў. Зьвязяцца каля 1,5 млн кв.м жыльля, пад офісы і гатэлі будзе адведзена 550 тыс. кв.м, на гандлёвыя мэты — 200 тыс. кв. м.

Сярод інвэстараў, запрошаных МГК «Ітэра» — маскоўская будаўнічая кампанія ГК СУ-155, якая спэцыялізуецца на панэльнай забудове (доля ў праекце — 15%), «Внуково-Инвест» (5%), якое зьяўляецца стратэгічным партнэрам «Ітэры» ў справе вынасу з тэрыторыі забудовы Менскага авіярамонтнага заводу, а таксама шэраг расейскіх банкаў.

Беларускія праектныя і будаўнічыя арганізацыі ў праекце не задзейнічаныя, «праз адсутнасьць адпаведнага вопыту ў сфэры высотнай пабудовы».

Бізнэс-цэнтар паміж вуліцамі МаксімаТанка і Кальварыйскай будзе складацца з комплексу будынкаў: 30-павярховага жылога дому і двух будынкаў вышынёй 43 і 54 паверхі. Жылы дом пабудуе ўсё тая ж тая ГК СУ-155.

Кіраўніцтва праекту пабудовы бізнэс-цэнтру на Танка запэўніваюць, што ён улічвае інтарэсы мясцовых жыхароў, не сапсуе выгляд гэтага раёну гораду і экалягічнае становішча. Аднак жыхары раёну ня згодныя з гэтым меркаваньнем. Пра тое ў траўні напісала газэта «Звязда». Людзей абурыла тое, што праект распрацавалі і пачалі ажыцьцяўляць без уліку іх меркаваньня. Сход жыхароў бліжэйшых вуліцаў арганізавалі толькі пасьля зьяўленьня на будучых будаўнічых пляцоўках бульдозэраў.



Да 2020 г. на месцы аэрапорту «Менск-1» паўстане міні-горад з насельніцтвам 55—60 тыс. чалавек.

**Сямён Печанко**

# Ложак і аральны сэкс

прапануе пасажырам бізнэс–клясы авіякампанія «Раянэйр».

Ryanair — адна зь першых так званых танных авіяліній. Гэта такія перавозчыкі, якія пайшлі па шляху максымальнага абмежаваньня выдаткаў. У іх самалётах не выдаюць газэтаў, ня кормяць, і ўсё такое. Затое білеты на такую лінію каштуюць больш чым даступна. Скажам, з Варшавы можна даляцець да Брытаніі і вярнуцца за 40 даляраў.

«Раянэйр» зрабіў сапраўдную рэвалюцыю на эўрапейскім рынку. Цяпер кампанія хоча заваяваць трансатлянтычныя маршруты. Але ў гэтым выпадку яна хоча пазмагацца ня толькі за ашчадных падарожнікаў, але і за багатыроў. Як? Заснавальнік і кіраўнік канцэрну Майкл О'Ліры публічна прапанаваў: «Эконом-кляса будзе вельмі танная — 10 эўра за білет — затое бізнэс-кляса будзе вельмі дарагая. Для самых-самых кліентаў. Усё забясьпечым. І ложкі, і аральны сэкс. Усё задарма. Плаціш за білет 5 тыс. эўра, і ўсё маеш за так».

Вядома, О'Ліры даў дыму. Але відэазапіс гэтага ягонага выбрыку за пяць дзён прагледзела ў інтэрнэце 120 тыс. чалавек. Пра яго напісалі паважныя СМІ.

Што вы думаеце? Пабачыўшы выгаду, маркетолягі «Раянэйру» ўчапіліся за плюху свайго шэфа. Прэс-сакратар кампаніі заявіў: Beds and Blowjobs будзе працоўнай назвай нашай паслугі ў клясе бізнэс. Мы ганарымся тым, што запіс нашай прэс-канфэрэнцыі стаў самым папулярным кліпам у сэкцыі «Падарожжы» на YouTube. … Ryanair пацьвярджае, што на прэс-канфэрэнцыі 17 чэрвеня прагучала прапанова, каб білеты ў эконом-клясу на трансатлянтычныя рэйсы каштавалі вельмі мала, ад 10 эўра ў адзін бок, пры гэтым кампанія хоча забясьпечыць найвышэйшыя стандарты ў бізнэс-клясе … і што працоўная назва паслугі перавозкі бізнэс-клясам гучыць як Beds and Blowjobs. … Мы ўражаныя, што перакладчык не знайшоў нямецкага адпаведніка слову Blowjobs. Моўны аддзел Ryanair бясплатна даставіць у любое месца ... першага пасажыра, які перакладзе словы Blowjobs на нямецкую мову», — гэтая заява вывешаная на сайце кампаніі.

Пераклалі б мы ім па-беларуску…

Усё гэта называецца цяпер «вірусная рэклама» — такія маркетынгавыя крокі, калі рэклямныя ці квазірэклямныя ролікі падхопліваюцца і распаўсюджваюцца самімі спажыўцамі. Тое самае практыкуюць некаторыя вядомыя палітыкі, па слов ў кішэню ня лезуць.

О'Ліры майстар маркетынгу.

Калі пару гадоў таму Ryanair адкрыў палёты з Дубліна да Рыму, О'Ліры асабіста пераапрануўся ў кардынала і абвяцу ў рэкляме: «Habemus самыя ніжнія цэны». За гэты выбрык яго пракляла ягоная ўласная маці, гарлівая каталічка. Што ж, ён і гэтую навіну пасьпяшаўся распаўсюдзіць.

**Г-к**




Майкл О'Ліры дзеля бізнэсу не зважае нават на рэлігійныя пачуцьці ўласнай маці.

## СЬЦІСЛА

### 400 даляраў за тысячу кубамэтраў

Да канца году сярэдняя цана прыроднага газу можа перавысіць $400 за тысячу кубамэтраў, заявіў намесьнік старшыні праўленьня «Газпрому» Аляксандар Мядзьведзеў. Новая цана грунтуецца на апошніх прагнозах манаполіі: цана газу параўнальна зь мінулым годам вырасьце на 47%, а цана на нафту маркі Brent вырасла за паўгода ўжо на 45%. Экспэрты не выключаюць, што такую ж цану «Газпром» выставіць і Ўкраіне. Цана для Беларусі застанецца зьніжанаю: магчыма, $200.

### Даляр пасунуць

У наступным годзе беларускі рубель прывяжуць да кошыку валютаў, паведаміў старшыня Нацбанку Пётар Пракаповіч. Такое палажэньне ўтрымліваецца ў праекце Асноўных накірункаў грашова-крэдытнай палітыкі на 2009 год. У кошык трапяць даляр, эўра і расейскі рубель.

### Запазычанасьць вырасла яшчэ на мільярд

Сукупная замежная запазычанасьць Беларусі на 1 красавіка склала $13 млрд. 630 млн. і вырасла за першы квартал гэтага году на 8% (на $1,007 млрд). Пра гэта сьведчаць дадзеныя, апублікаваныя ў статыстычнай справаздачы Нацбанку.

### Новы дырэктар СБ

Сусьветны банк прызначыў новага дырэктара па Беларусі, Украіне і Малдове. Ім стаў Марцін Райззр, які раней быў эканамічным дарадцам кіеўскага офісу СБ і прадстаўніком банку ва Ўзбэкістане. Стратэгічнымі напрамкамі падтрымкі СБ у Беларусі будуць энэргазьберажэньне, водазабесьпячэньне, а ў будучым, магчыма, транспартная сфэра.

### «Белавія» набыла пяты «Боінг».

На сёньня нацыянальная авіякампанія эксплюатуе чатыры самалёты «Боінг 737/500», адзін «Боінг 737/300», таксама адзін «CRJ-100LR». Пяты «Боінг» атрыманы ў лізінг ад амэрыканскай кампаніі «Міжнародная лізінгавая фінансавая карпарацыя» (ILFC — International Leasing Finance Corparation).

**СП; паводле БелаПАН, БЕЛТА, КоммерсантЪ**

# 24 %

**Віталь Тарас** працягвае гаворку на тэмы, узьнятыя Янам Максімюком у артыкуле «Апазыцыя павінна перагледзець свае мэты».

Артыкул Яна Максімюка «Апазыцыя павінна перагледзець свае мэты» выклікаў сапраўдны выбух водгукаў і камэнтароў на сайце nn.by. Аўтар патрапіў, што называецца, ухапіць нэрв дыскусіі, якая даўно насьпявала ў беларускім грамадзтве — прынамсі, інтэлектуальной яго частцы. Палемічны артыкул яўна зачапіў многіх апазыцыянэраў за жывое. Водгукі, натуральна, не былі адназначнымі.

Усяго праз некалькі дзён па яго публікацыі адбылося выключэньне з партыі БНФ аднаго з намесьнікаў старшыні — Алеся Міхалевіча. З фармулёўкай: «за непрымальную крытыку» кіраўніцтва Фронту. Цяжка было прыдумаць больш яскравы прыклад таго, што ў найбольш уплывовай дэмакратычнай партыі адбываецца крызіс. У партыі, дзе, згодна зь іншай публікацыяй у «НН», найвышэйшы працэнт моладзі.

Унутрыпартыйная барацьба за лідэрства ідзе ў любой партыі. Гэта нармальна, таксама як і наяўнасьць розных поглядаў сярод дэмакратаў. Аднак, калі зьмест палітыкі апазыцыі зводзіцца да кадравых пытаньняў, ды яшчэ напярэдадні выбараў, на якіх патрэбнае адзінства, міжволі ўспамінаецца шэксьпіраўская фраза: «Гніль завялася ў дацкім каралеўстве!»

Ян Максімюк зводзіць у адно цэлае тыя прэтэнзіі і страхі, якія ўжо сфармаваліся ў грамадзкай думцы часткі насельніцтва — і што да апазыцыі, і што да палітыкі кіраўніцтва РБ, і што да кірунку разьвіцьця Беларусі ў цэлым. Тут і адсутнасьць заўважных посьпехаў апазыцыі ў апошніх палітычных кампаніях, адсутнасьць



> Ці патрэбная беларускай дзяржаве грамадзянская вайна — хай сабе маленькая і пераможная?

асэнсаванай стратэгіі, зьніжэньне мітынговай актыўнасьці, адсутнасьць дыялёгу ня толькі паміж уладай і апазыцыяй, але і паміж рознымі часткамі грамадзтва, паміж рознымі пакаленьнямі беларусаў.

Пры гэтым Максімюк глядзіць на ўнутраную сытуацыю ў Беларусі звонку, неангажаваным поглядам, што дадае яму аб'ектыўнасьці. Але гэта і ня погляд чужога чалавека, якому няма справы да будучыні Беларусі, да беларускасьці. Падкупляюць спакойны тон і разважлівасьць аналітыка ў спалучэньні зь ягонай жа прыхаванай эмацыйнасьцю.

Праўда, аўтар, канстатуючы неабходнасьць перагляду мэтаў апазыцыі, не дае адказу — якімі ж, на ягоны погляд, павінны быць гэтыя мэты ў новых умовах.

Тым больш, што і ў самой пастаноўцы гэтых пытаньняў іншым разам выкарыстоўваюцца неперканаўчыя аргумэнты. У прыватнасьці, тэзіс пра тое, што беларускае грамадзтва стала больш прагматычным і мэркантыльным, а моладзь яшчэ менш заклапочаная лёсам нацыянальнай незалежнасьці, чым старэйшае пакаленьне, пацьвярджаюць вынікі апытаньня, праведзенага сёлета ў сакавіку НІСЭПД. Варта памятаць, што аднаго сацыялягічнага дасьледаваньня абсалютна недастаткова. Нават у Расеі існуюць некалькі сацыялягічных службаў, параўноўваючы зьвесткі якіх, можна рабіць больш-менш пэўныя высновы пра тэндэнцыі.

Але нават калі прыняць вынікі НІСЭПД, на якія спасылаецца ў сваім артыкуле Ян Максімюк (64% беларусаў лічаць, што паляпшэньне эканамічнай сытуацыі ў іхнай краіне зьяўляецца больш важным, чым захаваньне незалежнасьці; 24% маюць процілеглае меркаваньне), за абсалют, інтэрпрэтацыя гэтых вынікаў можа быць рознай. Напрыклад, 24% — амаль чвэрць апытаных — гэта многа ці мала?

Любы чалавек, які цікавіцца сацыялёгіяй, скажа, што гэта надзвычай высокая лічба для чыста палітычнага пытаньня. У любым грамадзтве. Ва ўмовах жа Беларусі гэтая лічба ўвогуле выглядае фантастычнай!

Парадыгму разьвіцьця грамадзтва фармуюць зусім ня масы, але нефармальныя эліты — «думаючая меншасьць». (Наколькі я разумею, у артыкуле Яна Максімюка вядзецца гаворка менавіта пра неабходнасьць новай парадыгмы, а не пра нейкія тактычныя ці каньюнктурныя зьмены ў дзейнасьці апазыцыі.)

Тыя дзьве трацінЫ, якія лічаць прыярытэтам эканамічныя зьмены, зусім неабавязкова лічаць незалежнасьць менш важнай. Яны могуць проста надаваць больш увагі яе эканамічнаму складніку, а не, скажам, ідэалягічнаму.

Што тычыцца паляпшэньня эканамічнай сытуацыі ў Беларусі, з чым не даводзіцца спрачацца, то, па-першае, няма ніякіх гарантыяў, што гэтая тэндэнцыя захаваецца цягам найбліжэйшых гадоў. Па-другое, паляпшэньне ўзроўню жыцьця людзей ня ёсьць гарантыяй таго, што яны гатовыя ахвяраваць дзеля гэтага сваёй нацыянальнай ідэнтычнасьцю і незалежнасьцю. Краіна Баскаў і Каталёнія не дэпрэсіўныя рэгіёны Гішпаніі. Тым ня менш, ня выключана, што ў недалёкай гістарычнай пэрспэктыве гэтыя, а магчыма, і іншыя рэгіёны Пірэнэйскай паўвыспы стануць незалежнымі дзяржавамі. Тут няма гаворкі пра тое, добра гэта ці дрэнна. Справа ў тэндэнцыі. І ў тым, што эўрапейская гісторыя яшчэ не завершылася.

Дапускаю, што працэнт адданых прыхільнікаў незалежнасьці і беларускай мовы сярод беларускай моладзі сёньня меншы, чым у грамадзтве ў цэлым. Моладзь становіцца ўсё больш прагматычнай і гатовая мірыцца з уладай у абмен на пэўныя «прывілеі». Але ці азначае гэта, што грамадзтва, а тым больш улада можа ігнараваць гэтую частку, а замест дыялёгу прапаноўваць турмы і выключэньне са школаў ды інстытутаў? Чым меней людзей будзе заставацца ў шэрагах прыхільнікаў незалежнасьці і нацыянальнага адраджэньня, тым больш радыкальнымі і безкампраміснымі могуць быць іх дзеяньні. Прыклад ІРА ў Паўночнай Ірляндыі тутака паказальны.

Ці трэба беларускаму грамадзтву заганяць патрыятычную моладзь у падпольле, пазбаўляючы яе пэрспэктывы ўпісацца ў грамадзтва і пераводзячы прадстаўнікоў гэтай моладзі ў разрад герояў нацыі? Ці патрэбная беларускай дзяржаве грамадзянская вайна — хай сабе маленькая і пераможная? У такой вайне ня можа быць пераможцаў. Магчыма, шчыры дыялёг з моладзьзю пра будучыню нацыі патрэбны ня толькі апазыцыі? Можа быць, і ўлада павінна перагледзець мэты і пачаць гаварыць зь людзьмі на іншай мове?

# Няшчасны сучасны Налівайка

Аўтар ідэі — Вадзім Гігін. Аўтар сцэнару — ён жа са таварышы... Піша **Наталка Бабіна**.

Ці любіце вы тэлевізар так, як я яго люблю?

У суботу днём чаму вы аддаяце перавагу — тэлевізару ці прапалцы кветніка?

Калі — раптам — тэлевізару, то вы ведаеце назву перадачы, якую я ня ведаю, і якую паглядзела выпадкова таму, што не хацелася займацца праполкай.

Аўтар ідэі — Вадзім Гігін. Аўтар сцэнару — ён жа са таварышы.

І маса масоўкі — нечытэльна хутка прабягае па экране. Кампазытар, грым, дырэктар — не запамінаецца. Але маса ўражвае! Вельмі ж іх шмат: нейкіх ахінейных статыстаў, што валакуцца на тле касьцёлаў да праваслаўя і народнасьці.

Вядоўца *тичится* выглядаць глыбакадумным. Блукае на тле



> Просталінейнасьць, напорыстасьць і ахінейнасьць — рысы сучаснай прапаганды.

рэнэсансавых вежаў і пратэстанцкіх збораў, даводзіць, як беларусы імкнуліся памерці праваслаўнымі і з надзеяй глядзелі ў будучыню у XVI стагодзьдзі. Як стараліся захаваць нацыянальную ідэнтычнасьць (гаворыцца гэта ўсё, вядома ж, па-расейску — расейскую, трэба думаць, ідэнтычнасьць імкнуліся захаваць нашыя продкі).

І хапае ж нахабства Гігіну са таварышы гаварыць ад імя Севярына Налівайкі, казацкага ватажка!

І хапае ж нахабства Гігіну са таварышы рабіць зь Севярына нейкага ідала, які спаў і бачыў, як бы патрапіць у мэйстрым сучаснай прапаганды...

Ой-ёй, Севярыне, гэй-ёй, Налівайка! Каб ты мог пракінуцца ды пачуць, што пра цябе гавораць цяпер...

Просталінейнасьць, напорыстасьць і ахінейнасьць — рысы сучаснай прапаганды, якія напоўніцу выявіліся ў шматсэрыйным фільме Гігіна, назвы якога я ня ведаю.

І ведаць не хачу.

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

### 16 чэрвеня

**Менск**

Рэдакцыя газэты **«Народная воля»** і намесьніца галоўнага рэдактара **Марына Коктыш** атрымалі з суду Маскоўскага раёну афіцыйныя адказы на свае скаргі. Судзьдзя **Вольга Гусакова** адмовіла журналістцы ў праве прыцягнуць да судовай адказнасьці Палату прадстаўнікоў за адмову акрэдытаваць яе. Рэдакцыя выданьня хацела таксама прыцягнуць да адказнасьці службу бясьпекі прэзыдэнта, чые супрацоўнікі не дазволілі М.Коктыш прысутнічаць на пасяджэньнях парлямэнту. Аднак атрымала адмову на той падставе, што як у журналісткі, так і ў рэдакцыі «адсутнічае права на зварот у суд». Юрысты кажуць, што з такой фармулёўкай адмовы яшчэ ніколі не сутыкаліся.

**Віцебск**

Паводле справы «лістоў ад РНЕ» ў абласной упраўе КДБ дапыталі сябра КХП–БНФ **Сяргея Каваленку**. Лісты з пагрозамі ад імя «віцебскай філіі «РНЕ» паўгоду таму атрымалі таксама яго аднапартыйцы **Ян Дзяржаўцаў** і **Ян Таўпыга** і актывіст **Барыс Хамайда**. Аўтары абяцалі адпомсьціць апазыцыянэрам за дзейнасьць «Мірона». На працягу 2006—2007 г. РНЕ пісала былому рэдактару газэты «Витебский курьер» **Уладзімеру Базану**, былой старшыні гарадзкой арганізацыі АГП **Алене Залескай** пагражала за апазыцыйныя палітычныя погляды, ад загадчыцы літаратурнай часткай тэатру «Лялька» **Вікторыі Дашкевіч** патрабавала перакласьці беларускамоўны рэпэртуар тэатру на расейскую мову. Па фактах зьяўленьня ў Віцебску лістоў ад імя прафашыстоўскай арганізацыі КДБ узбудзіў крымінальную справу.

### 17 чэрвеня

**Слонім**

Суд Слонімскага раёну прызнаў актывіста незарэгістраванага «Руху «За Свабоду» **Алеся Масюка** вінаватым у «арганізацыі несанкцыянаванай акцыі» (арт. 23.34 КаАП РБ) і пакараў штрафам 700 тыс. рублёў. Прысуд вынес судзьдзя **Аляксандар Шылін**. Пратакол на Масюка быў складзены праз месяц пасьля сустрэчы Аляксандра Мілінкевіча з жыхарамі гораду, паводле закону на гэта адводзіцца 10 дзён з моманту напісаньня рапарту. Судзьдзя адхіліў хадайніцтвы аб прыцягненьні дадатковых сьведкаў і пра свой адвод.

**Менск**

Лідэра Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Анатоля Лябедзьку** выклікалі ў Генэральную пракуратуру. Там ён быў папярэджаны аб адказнасьці за падачу загадзя ілжывых зьвестак у сувязі зь яго патрабаваньнем давесьці слушнасьць інфармацыі аб пастаўках беларускай зброі ў Вэнэсуэлу. Нагадаем, 19 траўня палітык накіраваў зварот генпракурору **Рыгору Васілевічу** з просьбай праверыць зьвесткі, надрукаваныя ў гішпанскай газэце «Эль Паіс» наконт паставак беларускімі структурамі зброі калюмбійскім тэрарыстам.

**Старыя Дарогі**

Сьвятара **Леаніда Акаловіча** прызналі вінаватым ва ўдзеле ў несанкцыяваным сходзе і далі 30 б.в. (1 050 000 тыс.руб.) штрафу. Такі прысуд вынес судзьдзя Старадароскага раённага суду **Сяргей Епіхаў**. Нагадаем, 19 красавіка ў вёсцы Дражна Старадароскага раёну быў усталяваны мэмарыяльны крыж у памяць аб жыхарах, зьнішчаных партызанамі 15 красавіка 1943 г. Крыж асьвяціў айцец Акаловіч.

### 18 чэрвеня

**Менск**

Міністэрства культуры адхіліла прапанову Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры аб наданьні бел-чырвона-беламу сьцягу статусу гістарычна-культурнай каштоўнасьці. Гэта было патлумачана «недастатковай аргумэнтаванасьцю і дакумэнтальнай абгрунтаванасьцю» прапановы грамадзтва. Акрамя таго, чыноўнікі спасляліся на заключэньні Інстытуту гісторыі і Інстытуту мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклёру АН, «якія сьведчаць пра неадпаведнасьць пададзеных матэрыялаў прававым нормам і нявывучанасьць гісторыі пытаньня».

### 19 чэрвеня

**Менск**

Міністэрства юстыцыі адмовіла ў рэгістрацыі праваабарончага асьветніцкага аб'яднаньня «Рух «За Свабоду». Паводле намесьніка старшыні аб'яднаньня **Юрася Губарэвіча**, Міністэрства юстыцыі прааналізавала шэраг выступленьняў у СМІ кіраўніка руху **Аляксандра Мілінкевіча** і некаторых іншых яго прадстаўнікоў і прыйшло да высновы, што дзейнасьць аб'яднаньня будзе насіць не грамадзкі, а палітычны характар. Па-другое, Мін'юст загадзя робіць прагноз, што дзейнасьць аб'яднаньня ня будзе адпавядаць заяўленым мэтам і задачам. Гэта была трэцяя спроба арганізацыі афіцыйна зарэгістравацца. Зноў атрымаў ліст ад Мінюсту і аргкамітэт па стварэньні Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі. Грамадзкаму аб'яднаньню адмаўляецца ў рэгістрацыі, бо Мін'юсту застаюцца незразумелымі «мэты, задачы, прадмет і мэтады дзейнасьці арганізацыі». Рашэньні Мін'юсту будуць аспрэчвацца ў Вярхоўным судзе.

### 20 чэрвеня

**Горадня**

Супрацоўнікі міліцыі затрымалі актывіста Беларускага прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці **Ўладзімера Таболу**, які распаўсюджваў газэты «Гродзенская салідарнасць» і «Свабода» каля прахадной заводу аўтамабільных агрэгатаў. Міліцыю выклікалі супрацоўнікі аховы заводу, якія спрабавалі перашкодзіць сп.Таболу. Міліцыянты адвезьлі актывіста ў пастарунак, дзе склалі пратакол аб канфіскацыі газэтаў. Найбліжэйшым часам выданьні пройдуць «экспэртызу» ва ўпраўленьні ідэалёгіі Гарадзенскага аблвыканкаму.

**СП**





# Русальле

Фотарэпартаж **Андрэя Лянкевіча.**





У вёсцы Кузьмічы, што на Любаншчыне, у нядзелю спраўлялі Русальле. Русальле — старадаўняе, яшчэ дахрысьціянскае сьвята, зьвязанае з культам русалак. Гэты абрад знік у 1970-ыя і зноў быў адноўлены 6 гадоў таму. Цяпер у русальлі бярэ ўдзел сем вёсак. Сем русалак змагаюцца, каб стаць галоўнай русалкай, на якой напрыканцы астатнія разарвуць вянок.



# Героі зялёнага поля

### Бастыян Швайнштайгер

Гол і дзьве галявыя перадачы бляндына Швайнштайгера забясьпечылі перамогу немцаў над партугальцамі — 3:2. 23-гадовы хаўбэк быў выдалены ў пройгрышным матчы з харватамі, таму прагнуў рэабілітавацца перад фанатамі і трэнэрам.

Дарэчы, падчас апошняга групавога матчу з Аўстрыяй, які Швайнштайгер правёў на лаве запасных, адбылася тэлефонная размова футбаліста з канцлерам Нямеччыны Ангелай Мэркель. «Яна мне сказала: «Гуляй, як на Чэмпіянаце сьвету-2006». Я і гуляў. Да рэкамэндацыяў бундэсканцлерын варта прыслухоўвацца», — кажа Швайнштайгер.

### Рушцю Рэчбэр

Ахвярай фантастычнай гульні турэцкай каманды стала Харватыя. Каманда Фаціха Церыма выратавалася ў трэці раз запар у дадатковы час. Адным з найбольш яркіх пэрсанажаў у турэцкім ансамблі быў брамнік Рушцю Рэчбэр, які ўвесь час стрымліваў атакі славянаў, а ў сэрыі пэнальці стаў сапраўдным героем.

Рушцю ехаў на першынство дублёрам, а месца ў варотах заняў толькі пасьля двухматчавай дыскваліфікацыі Валкана Дэмірэля. «Няхай памятаюць, што туркі ніколі не здаюцца», — сказаў пасьля гульні Рушцю Рэчбэр.

### Андрэй Аршавін

Футбол у Расеі перажывае рэнэсанс. Пасьля перамогі піцерскага «Зэніту» ў Кубку УЕФА прыйшла чарга і нацыянальнай каманды, якая выйшла ў паўфінал Эўра. Да абедзьвюх падзеяў непасрэдна спрычыніўся Андрэй Аршавін.

Цікава, што ці не палова гульцоў зборнай Расеі выйшла зь небагатых сем'яў, тое самае тычыцца і Аршавіна. Ці не адзінай магчымасьцю выбіцца ў людзі для іх быў футбол.

«Мы выйшлі на поле біцца, хацелі даказаць самім сабе, што наша каманда нечага вартая ў Эўропе», — сказаў аўтар трэцяга голу ў вароты галяндцаў Андрэй Аршавін.



**Палова гульцоў зборнай Расеі выйшла зь небагатых сем'яў, тое самае тычыцца і Аршавіна. Ці не адзінай магчымасьцю выбіцца ў людзі для іх быў футбол.**

### Ікер Касільяс

Самы нецікавы чвэрцьфінал разыгралі італьянцы і гішпанцы. Яны так і не змаглі забіць галоў у асноўны час, а ў сэрыі пэнальці сваё слова сказаў Ікер Касільяс, які адбіў два адзінаццацімэтровыя ўдары. Такім чынам, была зломленая сумная традыцыя, паводле якой гішпанцы шмат гадоў не выходзілі ў паўфіналы буйных спаборніцтваў.

«Пэнальці — гэта заўсёды латарэя, але, калі мы выйгралі, значыць, заслугоўвалі гэтага болей. Паражэньне ў гэтым матчы стала б для краіны сапраўднай трагедыяй, але мы аказаліся мацней», — сказаў 27-гадовы брамнік зборнай Гішпаніі.

**Зьміцер Панкавец**

# Эўра–2008
## вачыма беларуса

Насельніцтва Аўстрыі і Швайцарыі разам складае ўсяго 15 мільёнаў. І так цесна — а тут яшчэ мільёны фанаў з 16 краінаў. Зь Цюрыху піша **Ігар Маханёк**.

### Загадка пройгрышу галяндцаў

Чвэрцьфінал Нідэрлянды — Расея праходзіў у Базэлі. Да гэтай гульні прадаўцы піва і кілбасак з усёй Швайцарыі скардзіліся, што ўсе папярэднія гульні галяндцаў праходзілі ў Бэрне, і сталіца атрымала найбольш прыбытку. Аднак цяпер Базэль ужо адцягваўся, бо паводле розных прыкідак у горад прыехала ад 90 да 180 тысячаў прыхільнікаў аранжавых (у той час як насельніцтва альпійскага гарадка ўсяго каля 170 тысячаў).

Сапраўды, горад быў настолькі аднакалярowым, што ўзьнікала адчуваньне знаходжаньня дзе-небудзь у Эйндховэне. Фанаў расейскай каманды я налічыў каля 30—40 чалавек. Праўда, было часам цяжка адрозьніць фанаў, дзякуючы Пятру I і колеразьмяшэньню сьцягоў, але дапамагала наяўнасьць/адсутнасьць аранжавага ў вопратцы. Супрацоўнікі грамадзкіх службаў, у аранжавых спэцоўках, таксама ня дрэнна зьліваліся з натоўпам.

Каго падтрымлівала нясьцерпна гарачае сонца? Сказаць цяжка. Але чэргаў да стоек з напоямі, якія былі праз кожныя некалькі мэтраў па ўсім цэнтры гораду, адстаяць давялося нямала. У адрозьненьне ад Цюрыху, у Базэлі не адна фанзона, таму нам давялося прайсьці некалькі, пакуль мы дасягнулі той, дзе можна было нешта пабачыць зь яшчэ вольнага месца. Прыемна, што Базэль аказаўся падрыхтаваны да наплыву турыстаў. Хапала экранаў і піва на ўсіх. Нават гелікоптэр быў на суседнім даху, на ўсялякі выпадак.

Пра саму сустрэчу ўжо ўсё сказалі. Галяндцы вакол мяне таксама бачылі, што расейцы гуляюць нашмат надзейней і лепш. Чаму? Адзін з варыянтаў, бо на аранжавых вельмі паўплывала сьмерць дачкі Халіда Булахруза, якая здарылася за дзень да гульні. Нечакана было, што сам гулец узяў удзел у матчы.

Як вынік, горад стаў сьведкам сумнага аранжавага шэсьця да вакзалу і да іншых выхадаў з гораду. Некаторыя заўзятары плакалі (партугальскія фанаты пасьля сваёй паразы плакалі ўсе да аднаго як бабры), некаторыя працягвалі «Хёп Холанд», але большасьць проста сьцішылася. Адзінкавыя фанаты расейскай каманды былі шумныя, крычалі «Россия, мы с тобой!», сьпявалі Кацюшу.

Па дарозе назад, у дадатковым цягніку, было так цесна, што квіткі правяраць ня сталі. Але нягледзячы на цеснату, прадавец піва і вады ўсё ж такі прайшоў побач з намі — вось яно, швайцарскае дбаньне.

### І тарты зь мячыкам

Швайцарцы сапраўды добрыя гаспадары. Не чуваць скаргі на шумных футбольных фанаў, праз якіх перакрываюць цэнтар гораду на месяц, а ўвечары немагчыма заснуць. Яны ўсім сэрцам падтрымлівалі сваю каманду, якая на мясцовай гаворцы завецца проста «Швіцэ Нацы». Вось такое «непаліткарэктнае» скарачэньне, якое таксама нікога, акрамя хіба немцаў зь іхнай «Дойчэ Эльф», не бянтэжыць. Швайцарцы без праблемаў пераключыліся на іншыя каманды пасьля няўдалага выступу сваёй, таму нярэдка можна было пабачыць, напрыклад, аранжавых фанаў, нязьдольных правільна вымавіць «Хёп Холанд».

І, вядома, дзяржава, гарады і лічы што ўсе магчымыя камэрцыйныя арганізацыі зрабілі ўсё, што можна, каб Эўра было сапраўды сьвятам. У крамах — футбольная сымболіка ўсіх краінаў-удзельніцаў, у кандытарскіх — тарты з футбольнымі мячамі. Удзень ходзяць дадатковыя цягнікі і трамваі, а ўначы — аўтобусы па звычайным дзённым тарыфе.

Тэлеэкраны на вуліцах літаральна кожны квартал. Каля гарадоў-гаспадароў ёсьць агромністыя бясплатныя паркоўкі і кэмпінгі для тых, хто ня здолеў замовіць дарагія месцы ў гатэлях за колькі месяцаў. У фанзонах у час дажджоў бясплатна раздавалі плашчы, а як вярнулася сьпякота, паставілі вулічны душ. А якой рознакаляровай стала галоўная царква Цюрыха!

Усе газэты, разьлічаныя на масавага чытача, штодзень ставяць футбольныя навіны на першую паласу, нягледзячы на тое, што паралельна праходзяць скандалы з развалам найвялікшай партыі ў парлямэнце і няшчасным выпадкам у войску. Швайцарскі тэлеканал SF нядаўна паставіў рэкорд — болей за мільён гледачоў адначасова. Літаральна на кожным доме зь некалькіх вокнаў вісяць сьцягі. Прычым, ня толькі швайцарскія. Вельмі распаўсюджаныя партугальскія, гішпанскія, італьянскія, харвацкія і турэцкія штандары. Кожная трэцяя машына на вуліцы са сьцяжкамі, часам нават некалькіх краінаў. У трамваях у любы час можна сустрэць людзей у футбольнай атрыбутыцы. На абедах галоўная тэма — учорашняя ды сёньняшняя гульні.

### Ветлыя фанаты

Фаны, на дзіва, вядуць сябе вельмі прыстойна. Добра ўжываюцца між сабой заўзятары процілеглых камандаў. Ніякай агрэсіі ці хуліганства не заўважаецца. Па навінах пэрыядычна праходзіць што то тут, то там арыштоўваюць колькі дзясяткаў людзей, але гэта ўсё ж такі кропля ў моры. Гістарычныя гарады зусім не пацярпелі. Паліцыя максымальна карэктная — нават, каб зьняць групу фанаў, якія сядзелі на даху аўтобуснага прыпынку ў Базэлі, туды проста падняўся адзін паліцыянт у бэйсболцы і паразмаўляў з кожным пэрсанальна. Дапамагло.

Можа, не апошнюю ролю тут грае тое, што, каб атрымаць асалоду ад футболу ў Швайцарыі, трэба мець троху грошай. Нават калі спыніцца ў сяброў ці на кэмпінгу, то банальная пляшка піва каштуе 6—8 франкаў (12—16 тысячаў рублёў), а вядомыя швайцарскія кілбаскі — ад 5 да 10 франкаў (10—20 тысячаў). Дый калі ногі стамляюцца ад стаяньня ў фанзоне, і хочацца праехацца на грамадзкім транспарце, трэба быць гатовым выкласьці 3.90 CHF — амаль 8000 рублёў. Адно што, бэнзін таньнейшы, чым у суседняй Нямеччыне, але на аўто ў гэты месяц па горадзе езьдзіць цяжкавата. Хоць, насамрэч, можна ня траціцца і зусім — уваход у фанзоны бясплатны, з сваімі напоямі і ежай прапускаюць.

### Сьвятая сьвятых футболу

Каб патрапіць на стадыён, трэба было альбо выйграць у латарэю, альбо праз фан-арганізацыі краінаў-удзельніц набыць квіткі ў фэдэрацыі. Абедзьве крыніцы былі спустошаныя даўно. Таму апошнім часам заставаўся толькі чорны рынак — ці аўкцыёны ў інтэрнэце, ці на вуліцы перад матчам. 20 хвілінаў выбару варыянтаў ля цюрыхскага стадыёну «Летцыгрунд», і я здолеў патрапіць на вельмі цікавы групавы матч Італія — Румынія.

Розьніца паміж стадыёнам і праглядам на вуліцы калясальная. Напрыклад, у тым, што на стадыёне можна пачуць эмацыйную замежную гаворку, не зьмяшаную зь нямецкай і не заглушаную калёнкамі. За час гульні я пасьпеў добра вывучыць словы «бастардо» і «імпосыбэль». На жаль, аматары былі настолькі спакойныя і прыстойныя, што ніводнай мэксыканскай хвалі не прайшло.

Нечаканасьць — агромністыя экраны, на якіх паказвалі паўторы галоў і спрэчных момантаў. Калісьці я чуў, што такіх экранаў ня ставяць, каб не завадзіць публіку. Але, відаць, на Эўра гэтага не баяліся.

Зусім няшмат засталося да сканчэньня гэтага сьвята. Шкада будзе вяртацца да звычайнай руціны. Да таго, што ўвечары няма звыклага футболу. Але ж наступны швайцарскі прыпынак — Чэмпіянат сьвету па хакеі, засталося ўсяго 10 месяцаў!

**Ігар Маханёк**

беларус, спэцыяліст-камputарнік, двухразовы пераможца Кубку Яндэксу. Цяпер працуе ў Цюрыху на Google.

# Харонім Белая Русь

20 чэрвеня ў Інстытуце гісторыі Літвы адбылася пасьпяховая абарона дасьледаваньня «Лякалізацыя хароніму Белая Русь па эўрапейскіх пісьмовых і картаграфічных крыніцах XIII — сярэдзіны XVIII ст.» Працэдура абароны была ініцыяваная Інстытутам гістарычных дасьледаваньняў ЭГУ. ЭГУ таксама аказаў візавую і фінансавую падтрымку. Абарона гэтай дысэртацыі аказалася немагчымай у Беларусі, а вось у Эўрапейскім Саюзе гэта стала магчымым.

Беларусы маюць яшчэ аднаго доктара гісторыі. З Алесем Белым гутарыць Наталка Бабіна.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Наталка Бабіна: Паводле адукацыі Вы інжынэр-оптык, працуеце ў вялікай міжнароднай фірме, напісалі тры кнігі па кулінарыі, гадуеце чатырох дзяцей. Як адбываўся Ваш шлях у прафэсійныя гісторыкі?**

**Алесь Белы:** Мая дысэртацыя — вынік трынаццаці гадоў працы. Штуршком для прафэсійнай дасьледчыцкай працы было знаходжаньне ў Лёндане. Мяне ўразіў як высокі прафэсійны ўзровень ангельскіх гісторыкаў, так і высокі інтэлектуальны ўзровень сярэдняй клясы. Там я ў 1995 г. набыў якасную перадрукоўку сярэднявечнай мапы, на якой Белая Русь разьмяшчалася зусім ня там, дзе знаходзіцца Беларусь цяпер... Ад таго выпадку, мусіць, я і пачаў распрацоўваць тэму...

**НБ: Праблема шматкроць узьнімалася. У чым навізна Вашай дысэртацыі?**

**АБ:** Калі каротка, я паказваю, што назвы Беларусь, Белая Русь не былі прыдуманыя і ўведзеныя ў абарачэньне самімі беларусамі. Яны зьявіліся досыць выпадкова, нават кур'ёзна і спачатку адносіліся не да гэтай краіны. Назва была вынайдзена ў XIII ст. заходнеэўрапейскімі навукоўцамі-схалястамі. І яна для іх абазначала ня нашыя землі. Уяўнае адзінства пад назвай Беларусь існуе зусім нядоўга. Нават калі нейкія гісторыкі гэта прызнаюць розумам, то сэрцам прызнаць ня могуць. Мая дысэртацыя аказалася на вастрыні разбурэньня ілюзіяў.

Два гады я змарнаваў на тое, каб выканаць усе тыя ВАКаўскія патрабаваньні, часьцяком абсурдныя, якім павінна чыста вонкава адпавядаць дысэртацыя. Было страшэнна шкада часу, але пазьбегнуць гэтага немагчыма.

У адрозненьне ад эўрапейскіх краінаў, дзе для кожнай абароны ствараецца свой савет зь пяці адмыслоўцаў па канкрэтнай праблеме, у нас існуе такі Савет па абароне, куды ўваходзяць пятнаццаць чалавек, якія мусяць разьбірацца ва ўсіх тэмах.

Ні з маёй мэтадалёгіяй, ні з высновамі Савет па абароне не пагадзіўся. Недзе год пасьля гэтага я «адыходзіў». А потым вырашыў абараняцца ў Літве. Там зусім іншыя экзамены, я іх здаваў, перакладаў на расейскую мову тэкст...

**НБ: Я ведаю, што зараз рыхтуецца да друку Вашая кніга, прысьвечаная беларускай традыцыйнай кухні.**

**АБ:** Зараз рыхтуюцца да друку тры кнігі падобнай тэматыкі. Папершае, гэта зборнік «Наша страва» ў «Кнігарні «Наша Ніва» — зборнік эсэ розных аўтараў пра беларускія нацыянальныя стравы. Па-другое, кніга «Беларуская кухня», якая выйдзе ў ЗША. Гэта зборнік рэцэптаў. Працаваць над ёй было цяжка, бо ў амэрыканскім выдавецтве вельмі строгія патрабаваньні да тэксту, рэцэптур, усё павінна быць выверана і праправерана. Я пісаў яе па-ангельску, і выдавецтва зрабіла пяць рэдактур! А трэцяя кніга — «Энцыклапэдыя беларускай кулінарыі і гастраноміі», якая павінна выйсьці ў выдавецтве «Беларуская энцыклапэдыя», я там таксама ў ліку аўтараў.

Кулінарыяй цікаўлюся, бо ежа — ня толькі фізыялягічны працэс, гэта ж і сродак камунікацыі, праз які перадаюцца нацыянальныя асаблівасьці, нацыянальная ідэнтычнасьць. Да мяне час ад часу зьвяртаюцца людзі, якія хочуць адкрыць нацыянальны рэстаран, у якім бы падаваліся сапраўдная нашая ежа, а ня толькі дранікі і калбаскі па-магілёўску... на жаль, пакуль паўнавартага праекту такога ў Менску няма.

# У Беластоку расфармуюць катэдру беларусістыкі

Катэдра існуе ў Беластоцкім унівэрсытэце ад 1997 г. На тым тыдні яе кіраўнік, прафэсар Яўген Мірановіч, абвясьціў супрацоўнікам, што яна будзе расфармаваная.

Паводле ягоных словаў, «ад катэдры засталася толькі шыльда. Калі напачатку ва ўнівэрсытэце было шмат гадзінаў выкладаньня прадметаў, зьвязаных зь беларускай этнаграфіяй, гісторыяй, то на працягу апошніх пяці год супрацоўнікі больш не выкладаюць ніводнага такога прадмету. Выкладаюць гісторыю Польшчы, Ангельшчыны, Расеі. Да Беларусі няма цікавасьці. Так, у мінулым годзе не было ахвотных вывучаць беларускую філялёгію, таму не было набору, і цяпер мы ня маем першага курсу».

На катэдры працавала пяць чалавек. Яны не пагаджаюцца з прафэсарам. «Кожны з супрацоўнікаў займаецца распрацоўкай тэмаў, зьвязаных зь Беларусьсю, — кажа асыстэнтка катэдры Гражына Харытанюк. — Вядомыя працы гісторыкаў, якія працуюць на нашай катэдры, напрыклад, Алены Глагоўскай. Ірэна Матус, якая выкладае ва ўнівэрсытэце курс гісторыі Расеі, займаецца таксама беларускай этнаграфіяй. Тэма маёй дысэртацыі — «Абрад «Дзяды» ў Беларусі». Палявыя дасьледаваньні праходзяць менавіта ў Беларусі. Акрамя гэтага, я вяду курс ведаў пра сучасную Беларусь. Кожны з нас працягне сваю працу. Але важна, каб катэдра захавалася як цэнтар беларусістыкі на Беласточчыне».

Прыкрасьць адчувае і спадарыня Эльжбэта Смулкова, былы пасол Польшчы ў Беларусі, арганізатарка катэдры і яе першая кіраўніца. «Я памятаю пачатак, энтузіязм, — кажа яна. — Я спадзявалася, што прафэсар Мірановіч зможа гэта захаваць».

Пэўная цікавасьць да беларусістыкі ў Польшчы існуе. Праходзяць навуковыя канфэрэнцыі, працуюць беларускія ініцыятывы.

Трэба адзначыць, што аналягічная расейская катэдра ў Беластоцкім унівэрсытэце захаваецца. Беларускую ж замяніць, магчыма, катэдра міжнародных дачыненьняў.

**НБ**




# Гран-пры «Магніфікату» атрымала стужка пра Курапаты

21 чэрвеня на Глыбоччыне скончыўся IV Міжнародны каталіцкі кінафэстываль «Магніфікат-2008». Было паказана 35 фільмаў і праграмаў зь Беларусі, Польшчы, Швайцарыі, Італіі, Латвіі, Літвы, Расеі, Украіны, Канады, ЗША, Лівану, Грузіі і Харватыі.

Найлепшай карцінай прызнаная стужка Міхаіла Жданоўскага пра Курапаты. Герой фільму — мастак Анатоль Кузьняцоў — малюе абразы на камянях у народным мэмарыяле. Стужка **«Ва ўсе дні»** здымалася сёлета на «Беларусьфільме». Падчас яе «прыёмкі», кажуць, не абышлося без скандалу, хоць вострыя палітычныя моманты рэжысёр абмінуў. Фокус зроблены на служэньні мастака. Бо менавіта як служэньне расцэньвае ён сваю працу ў Курапатах.

Не былі абдзеленыя ўвагай і іншыя беларускія карціны. Прыз за найлепшую рэжысуру адышоў фільму Віктара Асьлюка **«Вальс»** — пра вясковага лекара, які дапамагае старым. Віцебскі аблвыканкам адзначыў стужку Станіслава Гайдука **«Айцец Сергій»**. Герой фільму выконвае паслушэнства — перакладае на беларускую мову Эвангельле.

Найлепшым дакумэнтальным фільмам прызнаная ўкраінская стужка **«Дзяўчаты. Дзяўчаты»** паводле сцэнару айца Ігара Сабко. Гераіні гэтай карціны абіраюць манаскі шлях.

Дыплёмам «За стварэньне цэласнага мастацкага вобразу ў дакумэнтальным фільме» ўзнагародзілі мэдытатыўную швайцарскую стужку Андрэа Канэты **«Гісторыя рук»**. Прыз арганізатараў фэсту — Каталіцкай асацыяцыі для камунікацыяў «Signis-Беларусь» — атрымаў польскі фільм **«Малы брат Шарль дэ Фуко»**. Узнагарода ад братэрскага фэстывалю Niepokalanow сышла ў Грузію (карціна **«Шлях Хрыста»**) Гасьцей уразіла, як эвангельскую гісторыю расказалі праз народную чаканку.

**Андрэй Расінскі**

## СЬЦІСЛА

### Свабодны тэатар адкрые школу

Свабодны тэатар неўзабаве адкрые сваю школу, заявіў Мікалай Халезін, арт-дырэктар тэатру. Паводле Халезіна, у школе будуць навучацца беларускія акторы, драматургі, тыя кадры, на якія зможа ў будучым абапірацца Свабодны тэатар. 21 чэрвеня ў прывытным памяшканьні ў Менску адбыўся паказ спэктаклю «Нажніцы». Яго паглядзелі каля 50 чалавек, пераважна маладыя людзі.

### У Магілёве стартаваў фэстываль «Магутны Божа»

З 23 па 28 чэрвеня ў Магілёве адбываецца XVI Міжнародны фэстываль духоўнай музыкі «Магутны Божа». Апроч беларусаў, у фэстывалі бяруць удзел прадстаўнікі Нямеччыны, Польшчы, ЗША, Кітаю, Украіны, Расеі. Праграма разнастайная: царкоўны дзіцячы хор з Хоцімску, расейскі ансамбль салістаў «Эрмітаж», арганныя канцэрты ў касьцёле Сьв.Станіслава і праваслаўнае сьвята званоў на Архірэйскім вале. Шмат гадоў журы фэстывалю ўзначальваў прафэсар Віктар Роўда. Сёлета на фэсьце пройдзе вечар ягонай памяці. Успомнякь і музыказнаўцу і дасьледчыка беларускай культуры зь Вялікай Брытаніі Гая Пікарда, які таксама быў сябрам журы. У гонар памяці музыкантаў упершыню гучыць новы твор кампазытара Ігара Мацієўскага.

### Гаўрылу Вашчанку 80 гадоў

20 чэрвеня споўнілася 80 гадоў народнаму мастаку, ляўрэату Дзяржаўнай прэміі, прафэсару Гаўрылу Вашчанку. Менчукам ён вядомы сваім пано «Асьветнікі» ў Доме настаўніка, вітражамі для Дому кіно (Чырвонага касьцёлу). Сяргей Харэўскі ўключыў ягонае палатно «Жнівень» (1975) у сьпіс 100 найлепшых твораў беларускага мастацтва XX ст. Шэраг палотнаў мастак прысьвяціў важным падзеям беларускай гісторыі: «Грунвальдзкая бітва» (1985), трыпціх пра паўстаньне Кастуся Каліноўскага «За зямлю, за волю» (1983), «Баляда пра мужнасьць» (1974). Г.Вашчанка стварыў вобразы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Эўфрасіньні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Канстанціна Астроскага. Гомельская Галерэя Г.Вашчанкі распачала сьвяточную выставу работаў майстра.

**Антон Тарас, catholic.by, Эўрарадыё**

# Казка пра «добрую» мачыху



## Бэнэфіс актораў «другога пляну»

20 чэрвеня я ўжо баяўся, што ўвайду ў Купалаўскі мокрым: усё за акном абяцала дождж. Аднак хмары разышліся, сонца прыпякло, і нават турыстычная група, загнаная ў «культурную ўстанову», павесялела і перастала абмяркоўваць набытыя ў менскіх крамах транты. Усе падрыхтаваліся спажываць свае «сто пудоў мастацтва». На вялікай сцэне ішла «Дзіўная місіс Сэвідж». Піша **Аляксандар Фядута**.

П'еса Джона Патрыка пра бабульку-мільянэрку, якую пасынкі запраторылі ў ціхую вар'ятню, каб атрымаць сто мільёнаў даляраў (і гэта, падкрэсьлім, у пяцідзясятыя гады XX стагодзьдзя!), добра вядомая на постсавецкай прасторы. Галоўную ролю ў ёй бліскуча гралі Фаіна Ранеўская, Вера Марэцкая, а ўжо зусім нядаўна — у нейкім расейскім фільме — у яе ўляпалася і Барбара Брыльска. Таму ня будзем пераказваць сюжэт, як ня будзем займацца і такой няўдзячнай справай, як параўнаньне ўбачанага і перажытага. Купалаўскі — тэатар цалкам самадастатковы, таму на яго інтэрпрэтацыі і засяродзімся.

У галоўнай ролі — Зоя Белахвосьцік. На сцэне зьяўляецца жанчына сярэдняга веку ў туга насунутым пад сумнеўнай эстэтыкі капялюшыкам сівым парыку, гучна і выразна (дзякуй ад дальніх шэрагаў!) вымаўляе кожную фразу. Вочы прыкрытыя акулярамі з тоўстым шклом. Імаверна, так акторка і рэжысёр (Аляксандар Гарцуеў) уяўляюць сабе старасьць: сівы парык, тоўстае шкло акуляраў і гучны голас з выразнай дыкцыяй, заклікаючы сьведчыць, што гераіня і сябе чуе зь цяжкасьцю.

Зь першага імгненьня свайго прабываньня на сцэне гэтая дзіўная місіс Сэвідж апанавана прагай помсты сваім пасынкам. Яны ये крыўдзілі. Калі яна спрабавала ўзяць малечу Лілі-Бэл на рукі пры першым знаёмстве, тая адразу ўкусіла мачыху. З таго часу бакі проста ня могуць дамовіцца.

Канечне, пасынкі паказаныя натоўпам разнапляновых маральных пачвараў. Сэнатар Ціт Сэвідж (стары балбатун-мямля ў цудоўным выкананьні Ігара Дзянісава), разьведзеная польская княгіня Лілі-Бэл (доўгія чырвоныя пазногці на руках Алены Сідаравай дапамагаюць гледачу не забыцца пра ўе вампірскую сутнасьць нават тады, калі яна коткай лашчыцца то да мачыхі, то да першага стрэчнага мужчыны); нарэшце судзьдзя Сэм'юэл Сэвідж (шыкоўны Павал Адамчыкаў, якому найлепш удаецца ўключэньне і выключэньне таршэру ў хвіліны ціхага шаленства). Яны здаюць сваю цудоўную, неймаверна добрую мачыху ў вар'ятню, таму што толькі такім чынам можна перашкодзіць ёй змарнаваць бацькаву спадчыну. Пры гэтым самі яны — хутчэй пацешныя недарэкі, чым магутныя злодзеі.

Такіх цяжка ўзьненавідзець. Але сваю нянавісьць да гэтых людзей, у якіх яе гераіня не змагла выхаваць дабрыню, Зоя Белахвосьцік іграе ад першай хвіліны. Можа быць, таму дабрыня ў гэтай ролі ў яе самой выходзіць значна горш. Бо зычнасьць голасу і дакладнасьць маўленьня — вялікая, згадзецеся, вартасьць для шасьцідзесяцігадовай місіс Сэвідж — кепска спалучаюцца з спробамі іграць інтанацыяй. Атрымліваецца такая завуч з правінцыйнай школы, якая і ўхвалу, і дакор выказвае аднолькава хораша пастаўленым голасам і з інтанацыямі «вучылкі са стажам». Акуляры, дарэчы, і старамодны сівы парык давяршаюць гэтае падабенства.

Вядома ж, глядач змушаны даваць веры ўсяму, што адбываецца на сцэне. Нават таму, што гэтая місіс Сэвідж была жонкай бацькі дзетак, якія нарадзіліся, калі ёй было — з самай вялікай нацяжкай! — гадкоў пяць, ну — дзесяць… (Магчыма, Аляксандар Сэвідж быў пэдафілам — у такой трактоўцы). Ёй, імаверна, своечасова не далі ў адказ цяпнуць зубкамі малую Лілі-Бэл, вось яна і пачала вастрыць зубы на пасынкаў. Таму што старасьць, як і дабрыню, сп-ня Белахвосьцік у гэтай ролі грае, мякка кажучы, на той самай ноце, што і прагу помсты. То бок расказваюць нам казку пра добрую пажылую мачыху і злых пасынкаў, а глядач пераконваецца, што ўсё гэта — няпраўда, і абодва бакі адзін аднаго вартыя.

І гэта пры тым, што імя Сэвідж для аўтара і першых гледачоў ягонай п'есы сьведчыла пра многае. Кларк Сэвідж-малодшы — герой папулярных у 1930-я амэрыканскіх коміксаў, носьбіт ідэі дабра, абаронца слабых і гаротных. У пяцідзясятыя гады коміксы пра Сэвіджа былі перавыданыя, таму пажылая спадарыня ў нягеглым капелюшы цалкам магла быць ягонай жаночай іпастасьсю. Але нават у гэтым разе яе варта было пакінуць пажылой спадарыняй, а ня кепска загрымірavanай «супэргераіняй» Ларай Крофт.

Выкажам гіпотэзу. Акторка Зоя Белахвосьцік занадта ўважліва слухала рэжысёрскія парады Аляксандра Гарцуева. Вось і выйшла тое, што выйшла. Прытым што акторка Зоя Валянцінаўна сапраўды харошая. Можа, проста ролі для сямідзесяцігадовых прымадон ёй граць яшчэ ранавата.

Затое з акторамі другога пляну рэжысёр папрацаваў, магчыма, трохі менш. Таму ў выніку мы ўбачылі некалькі маленькіх акторскіх шэдэўраў — зь ліку пацыентаў «Ціхага прыстанку». Атрымалася, як у тым амэрыканскім фільме, калі ўсе акторы другога пляну намінаваныя, а галоўных герояў на «Оскар» нават не зьбіраліся высоўваць.

Вось Фэры — Яна Русакевіч. Яна — як маленькая дзяўчынка (тыпаж — «Жалезная Кнопка» з «Пудзіла»), з кароткай хлапчуковай стрыжкай, зьдзіўлена раскрытымі вачыма, верай у сваю праўду. Яна — добрая. Ёй ня трэба граць дабрыню, ёй даеш веры. Нават у вельмі складаны момант — калі яна выносіць ляльку, якую лічыць сваім дзіцем. Я калісьці даводзіў сваім вучням у школе, што Някрасаў — геній, апэлюючы да главы «Сялянка» з «Каму на Русі жыць добра»: роспалаць цела сына паказана вачыма маці, якая балянсуе на мяжы вар'яцтва. Гэта вельмі цяжка — граць вар'яцтва матчынай любові. Яна Русакевіч патрапіла гэта зрабіць.

Вось Флёрэнс — Ганна Хітрык, кудлатая і акулярыстая істота, якой у жыцьці любові не дасталася. Затое ў яе вялізнае любячае сэрца. Яна ў кожным бачыць сябра, бачыць, што сустрэчны чалавек таксама любіць яе. Ганна Хітрык купаецца ў гэтай ролі, відавочна імправізуе, жартуе — і заля рэагуе ўдзячным сьмехам (і кветкамі).

Вельмі стрыманы і арганічны Джэфры — Аляксандар Маўчанаў. Лётчык, зьбіты ў часе вайны, адзіны, хто ацалеў з экіпажу, ён падаецца цалкам здаровым — калі б ня шнар на твары, які ён сам сабе выдумаў. Сцэна, калі ён у белым фраку падымаецца па ўсходах (гарцуеўскае захапленьне лесьвіцамі пераўтвараецца ў такі самы штамп, як «шматзначныя» канцоўкі Пінігіна) і грае на раялі, плястычна сыграная настолькі дакладна, што ў нейкі момант, седзячы ў другім шэрагу і маючы магчымасьць бачыць, што раяль — бутафорскі! — я даў веры, што грае сапраўды Джэфры.

Да пары яму і ягоная жонка — місіс Вілі. Яўгенія Кульбачная добра грае ролі «жанчын з трагічным лёсам»: што запалая на малалетку аканомка зь «Дзяцей Ванюшына», што аўдавелая каралева, якая прынікаецца перад простай жанчынай. І на гэты раз — акторцы хапіла сілаў сыграць трагедыю каханьня — калі яна тлумачыць місіс Сэвідж, чаму ня можа пакінуць «Ціхі прыстанак», словы пра тое, што Джэфры — яе муж, робяцца для гледача адкрыцьцём, хоць усе акцэнты былі, паводле тэксту п'есы, расстаўленыя ад самага пачатку спэктаклю.

Трохі занадта, на наш погляд, камікаваў у ролі Ганібала Віктар Манаеў, але і ў вялікіх актораў можа балець зуб ці здарыцца непрыемнасьць у сям'і. Прынамсі, злосьці на ягоным твары і ў ягоным голасе не было.

І менавіта таму, што ўсе яны — улучна з доктарам Эмэтам (вельмі дакладны ў расстаноўцы акцэнтаў у гэтай ролі Георгі Маляўскі) — пасапраўднаму добрыя і кранальныя, яшчэ менш верыцца ў шчырасьць дабрыні той дзіўнай дамы без узросту, якую, з волі рэжысёра, нам даводзіцца прымаць за добрую місіс Сэвідж. У тым сьвецe, які завецца «Ціхі прыстанак», на фоне плыняў дабра, якія літаральна выпраменьваюцца ўсімі яго жыхарамі, прага помсты і жаданьне любым коштам паквітацца зь дзяўчынкай толькі за тое, што шмат гадоў таму яна ўкусіла цябе за палец, успрымаецца вельмі дзіўна.

А іншыя аргумэнты адсутнічаюць. Таму нічога дзіўнага ў тым, што такую мачыху пасынкі здалі ў вар'ятню, для мяне асабіста няма. Дзіўна іншае — што яе адтуль выпускаюць. Мільянэрка, апанаваная прагай помсты, — гэта, ведаеце, у-у-у! Небясьпечна! На прыкладзе графа Монтэ-Крыста пераканаліся.

**Аляксандар Фядута, глядач**

20 гадоў таму была адкрытая праўда пра Курапаты. Тады ж выйшлі на яву іншыя страшныя факты.

**Дваццаць гадоў таму, 3 чэрвеня 1988 году сьвет даведаўся праўду пра Курапаты. Гэта стала магчымым дзякуючы публікацыі ў газэце «Літаратура і мастацтва» артыкулу Зянона Пазьняка і Яўгена Шмыгалёва «Курапаты — дарога сьмерці». Артыкул меў велізарны рэзананс. На той хвалі сталі вядомыя новыя месцы масавых расстрэлаў саветамі.**

**Гісторыю пра тое, як стала вядомым яшчэ адно месца бальшавіцкіх злачынстваў у Менску, а менавіта — на тэрыторыі сучаснага парку Чалюскінцаў, распавядае журналіст Раман Якаўлеўскі.**

**Яшчэ не аціх розгалас ад артыкулу «Курапаты — дарога сьмерці», а пісьменьнік Васіль Хомчанка, супрацоўнік пракуратуры ў адстаўцы, вырашыў надрукаваць у «ЛіМе» артыкул пра масавыя расстрэлы на тэрыторыі сучаснага парку Чалюскінцаў. Называўся ён «Прагулка па парку з пракурорам». У ім, са словаў былога пракурора, непасрэднага сьведкі экзэкуцыяў, падрабязна апісваліся працэдура і месца расстрэлаў у лесе, на ўскрайку Менску, дзе цяпер ласна і месьціцца парк Чалюскінцаў. Завярстаны тэкст быў ужо адвезены ў галоўную рэспубліканскую друкарню (сёньняшні Дом друку). Аднак надрукаваць яго не пасьпелі, бо, нібыта, сапсавалі форму. Як стала вядома пазьней, артыкул не прайшоў цэнзуры ЦК КПБ. Магчыма, каб не нарабіць лішняга шуму вакол чарговага адкрыцьця, быў задзейнічаны «тэхнічны» варыянт.**

**Знаёмыя супрацоўнікі друкарні вынесьлі з цэху фотапластыны з тэкстамі В.Хомчанкі і З.Пазьняка — нумар за 2 верасьня 1988 г. мусіў працягнуць тэму Курапатаў.**

**Каб артыкул дайшоў да чытачоў, было вырашана надрукаваць яго па-расейску ў газэце Латыскага Народнага Фронту «Атмода» («Абуджэньне») (у той час Раман Якаўлеўскі зьяўляўся ўласным карэспандэнтам газэты — «НН»). Літаратурны пераклад на расейскую мову зрабіў Віктар Навуменка, які тады працаваў у НДІ ўжытковых фізычных праблемаў БДУ.**

**Віктар Іванавіч да ўсяго меў уласны досьвед у стварэньні самвыдату — разам з Р.Якаўлеўскім выдаваў часопіс «Грамадзянін» на расейскай і на ангельскай мовах. У Беларусь трапілі каля 200 асобнікаў латыскай газэты. «Прагулка па парку з пракурорам» хутка стала тэмай для гутарак у незалежніцкім асяродку.**

**Сам аўтар артыкулу быў зьдзіўлены, калі пабачыў яго ў перакладзе на расейскую мову, бо нікому таго не даручаў. Пазьней у парку зьявілася каплічка ў памяць закатаваных, побач зь якой з таго часу штогод на лістападаўскія Дзяды запальваюцца зьнічкі.**

***Запісаў Сямён Печанко***




**Фотапластыны з тэкстам В.Хомчанкі, якія не прайшоў цэнзуру ЦК, таемна вынесеныя з друкарні.**

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Прагулка па парку з пракурорам

З падпалкоўнікам юстыцыі ў адстаўцы Міхаілам Абрамавічам я знаёмы даўно. Мы шмат гадоў служылі разам у Менскім гарнізоне — ён у ваеннай пракуратуры, я — у трыбунале. Часта ён удзельнічаў у судовых працэсах, на якіх я старшыняваў. І, трэба сказаць, я заўсёды быў рады, калі яго вылучалі абвінаваўцам у разгляданых мною справах. Кваліфікаваны юрыст Міхаіл падыходзіў да кожнай справы і кожнага падсуднага толькі зь меркай справядлівасьці і гуманнасьці, рашуча адмаўляўся падтрымліваць абвінавачваньне па эпізодах, якія ня мелі цьвёрдых доказаў. Меркаваньні яго і маё, як правіла, супадалі і ў кваліфікацыі злачынных дзеяньняў падсуднага, і ў меры пакараньня. Допыты падсудных, пацярпелых, сьведак ён вёў умела, разумна, часам дасьціпна. Гэтак жа кваліфікавана ён праводзіў і папярэднія сьледзтвы, дапамагаючы сьледчым разблытваць, здавалася б, безнадзейныя справы. Адным словам, Міхаіл Абрамавіч быў сапраўдным юрыстам і мог бы займаць значна большую пасаду, чым тую, якую займаў. Франтавік, адзначаны многімі баявымі ўзнагародамі, з даваенным партыйным стажам, ён аддаў вайсковай службе больш за трыццаць гадоў.

Нам здавалася тады, што мы ведалі адзін пра аднаго ўсё. Мы і сапраўды шмат пра сябе расказвалі, але гэта былі аповеды ў асноўным пра вайну, вучобу і, безумоўна, пра розныя крымінальныя гісторыі і юрыдычныя казусы, зь якімі кожнаму з нас даводзілася сустракацца па службе. Аднак у нас былі і свае таямніцы, пра якія мы тады маўчалі, хавалі. Асабліва сваю таямніцу хаваў я.

Жыў я тады насупраць парку Чалюскінцаў, куды часта заходзіў пасядзець сярод соснаў. Аднойчы, кіруючыся ў гэты парк, я сустрэў Міхаіла Абрамавіча і запрасіў яго прагуляцца па паркавых дарожках. Ён адмовіўся.

— Не люблю гэты парк, — сказаў ён, — абмінаю яго.

— Сасновы дух не пераносіш?

— Ды не, замяўся ён, — тут скрозь магілы. Не магу па людзкіх касьцях хадзіць.

Я чуў, што ў час акупацыі немцы расстрэльвалі ў парку нашых людзей, і падумаў, што Міхаіл Абрамавіч меў на ўвазе іх магілы. Гаворка тады на гэтую тэму не прадоўжылася, а пасьля і забылася.

За мяне Міхаіл Абрамавіч старэйшы на пяць гадоў, і армейскі стаж у яго даўжэйшы — прызываўся ён яшчэ ў трыццаць пятым з родных сваіх Плешчаніц, дзе нарадзіўся, жыў, скончыў школу. А прызвалі яго на тэрміновую службу ў войскі наркамату ўнутраных справаў. Расказаў, што, будучы на той службе, ахоўваў унутраную турму з палітычнымі вязнямі, канваіраваў арыштаваных на суд — рабіў тое, што рабілі і робяць вайскоўцы гэтага войска.

Неяк, шпацыруючы Ленінскім праспэктам, мы апынуліся каля будынку Міністэрства ўнутраных справаў рэспублікі. Міхаіл Абрамавіч завярнуў на вуліцу Ўрыцкага, празь некалькі крокаў спыніўся і паказаў на бэтонныя выступы-парожкі каля сьцяны будынку.

— Вось тут у трыццатыя гады былі вокны з кратамі. А ўнізе — падвальныя камэры, дзе сядзелі арыштаваныя, так званыя ворагі народу. А я, шараговец, вартаваў гэтыя вокны. Хадзіў зь вінтоўкай каля вокнаў па тратуары. Калі, часам, там, у камэры, зашумяць, я прыкладам аб тратуар пагрукаю, каб сьціхлі. Гэта было ў 1936—1937-х гг., — расказваў Міхаіл Абрамавіч. — У тых падвальных камэрах я ня быў, ня ведаю, вялікія яны ці малыя, але ведаў, што людзей туды было напхана як селядцоў у бочку. Дзень і ноч з тых вокнаў ішла пара, як з лазьні.

Вось цяпер я і вярнуся да сваёй таямніцы, якую я хаваў і ад Міхаіла Абрамавіча. У адной з тых падвальных камэр у красавіку—ліпені трыццаць сёмага году сядзеў я. Значыць, Міхаіл Абрамавіч і мяне тады ахоўваў, і, можа, на мой голас грукаў прыкладам і тупаў ботам, прымушаў сьціхнуць. Нам з тых камэр былі відаць толькі ногі вартавога і прыклад яго вінтоўкі — калі яны набліжаліся да кратаў. Вокны камэры знаходзіліся пад самай столлю, і, каб убачыць нешта на вуліцы, трэба было станавіцца на ложак. Мы так і рабілі, калі вартавы адыходзіў ад нашага акна…

Пра свой арышт, судовасьць я адкрыўся толькі пасьля вайсковай службы, калі выйшаў на пэнсію. А асуджаны я быў у трыццаць сёмым годзе. Спэцыяльнай калегіяй Вярхоўнага суду БССР за так званую антысавецкую агітацыю на чатыры гады лягеру і тры гады паражэньня ва ўсіх правах пасьля адбыцьця пакараньня.

Мая судовасьць, пра якую я адкрыўся, зьдзівіла ўсіх знаёмых і асабліва маё трыбунальскае начальства. Як жа так. Не разумелі людзі, чалавек, асуджаны за дзяржаўнае злачынства, быў судзьдзём трыбуналу і сам судзіў? Мала таго, зь нязьнятай судовасьцю, з паражэньнем правоў удалося пайсьці ў войска, уступіць у камсамол (другі раз, да арышту я ўжо быў камсамольцам), потым у партыю, скончыў вайскова-пяхотнае вучылішча, ваяваў, атрымаў і ордэн, і мэдалі, а пасьля вайны паступіў і скончыў ваенна-юрыдычную акадэмію, куды быў адбор слухачоў вельмі строгі. Трэба сказаць, што я і сам у тыя гады зьдзіўляўся: чаму мяне ня выкрываюць, ня спыняць маю кар'еру? А я ішоў напралом, ламіўся ў самыя строга ахаваныя службовыя дзьверы. У аўтабіяграфіі і анкетах я, вядома ж, пра сваю судовасьць не пісаў.

Адразу пасьля вайны мне, як і многім маладым афіцэрам-франтавікам, быў прапанаваны выбар вайсковых вучэбных установаў. Я мог паступіць у вайскова-мэдыцынскую, артылерыйскую, вайскова-палітычную акадэміі, у вайсковы інстытут замежных моваў. А я выбраў вайскова-юрыдычную акадэмію. Далібог, была б прапанова ў акадэмію дзяржбясьпекі, паступіў бы туды. Я быў упэўнены, што мяне правяралі асабіста неаднойчы, і не маглі не даведацца пра маю судовасьць — усе асуджаныя ў нас на строгім уліку. Тады ж чаму мне пра гэта не гавораць, а наадварот, расчыняюць перада мной усе дзьверы?

Усё раскрылася ў час маёй рэабілітацыі ў 1969 г. У пракуратуры рэспублікі, куды я занёс заяву аб пераглядзе маёй справы, зьдзівіліся ня менш за маіх сяброў. Пракурорам БССР быў тады Пастрэвіч, зь якім я ў яго бытнасьць вайсковым пракурорам Беларускай вайсковай акругі быў у добрых стасунках. Ён, генэрал-маёр юстыцыі, быў і маім земляком, родам з Магілёўшчыны. «Васіль, суджаны? — ня верыў ён. — Ня можа быць». І ўжо зусім не паверылі мне ў той пракуратуры, калі ў маёй прысутнасьці пазванілі ў Камітэт дзяржбясьпекі Беларусі і спыталі дадзеныя пра маю судовасьць. Адказалі хутка, хвілін праз восем: Хомчанка В.Ф. сярод асуджаных ня значыцца. Такі ж самы адказ прыйшоў пасьля і з Масквы. Я ж, вядома, настойваў на праверцы маёй справы, і з пракуратуры, запісаўшы назву лягеру, дзе я адбываў прысуд, паслалі запыт туды. Адтуль і пацьвердзілі, што я знаходзіўся ў Ніжне-Амурскім лягеры, вызваліўся 8 красавіка 1941 г. Пасьля гэтага ў архівах КДБ знайшлася і мая справа. Вярхоўны суд БССР перагледзеў яе і рэабілітаваў мяне поўнасьцю.

А цяпер трэба растлумачыць, чаму ж я са сваёй судовасьцю так і застаўся ня выкрыты. Мне вельмі пашанцавала: пры вывазе зь Менску ў час вайны архіваў НКВД мая ўліковая картка ды, відаць, і сама справа былі засунутыя ці то ня ў тую скрынку, ці то, можа, нават ня ў тую папку. Таму пры праверках сярод асуджаных маё прозьвішча і не знаходзілі.

Пачуў пра маю рэабілітацыю Міхаіл Абрамавіч і сустрэўся са мной:

— Слухай, — ускрыкнуў ён, — дык мы з табой маглі яшчэ тады сустрэцца! Я цябе мог канваіраваць з

турмы ў турму, на суд, і, канечне, папярэджваў: «Крок улева ці крок управа лічыцца спробай ўцёкаў — буду страляць».

— Можа, і папярэджваў, — ды я ня думаў уцякаць.

— А тое, што я цябе вартаваў у тым падвале на Ўрыцкага, дык гэта дакладна. Усе месяцы тваёй адседкі я якраз і стаяў там вартавым.

— Грукаў прыкладам, калі я чытаў вершы.

— Дык гэта ты чытаў? Мне цікава было слухаць, і я часам ня грукаў. Свае вершы чытаў?

Я сказаў, што ў той камэры сядзелі паэты, яны чыталі складзеныя там паэтычныя радкі. Па суседзтву з нашай камэрай — даведаліся па перастуку — пакутаваў Мікола Хведаровіч, у другой — Міхась Чарот, Юрка Лявонны. У маёй камэры знаходзіліся ажно тры літаратары: пісьменьнік і акадэмік Янка Нёманскі, паэты Янка Тумiловіч і Майсей Сяднёў — студэнт пэдагагічнага інстытуту, таленавіты хлопец. Камэра наша, разьлічаная ў нармальны час на чатыры чалавекі, зьмяшчала тады ажно дзесяць. Дыхаць не было чым, вось і ішла пара з акенца, як з лазьні. З тых вязьняў — аднакамэрнікаў уцалелі я і Майсей. Астатніх расстралялі.

Расстралялі Янку Нёманскага, інжынэра цагельнага заводу Блохмана, камісара авіяцыйнага палка Іванова (у камэру ён зьявіўся ў прыгожым скураным паліто-плашчы, якое даваў прымерваць і мне). Расстралялі чыгуначніка-забесьпячэнца Зібермана, ці Зіберштэйна, забыў прозьвішча. Расстралялі двух калгасьнікаў з Лагойскага раёну, калгасьніка-баптыста, узятага ўжо ў другі раз. Мяне і Сяднёва суд пашкадаваў, улічыў нашу маладосьць — мне толькі споўнілася васямнаццаць. Дзякуй тым судзьдзям Спэцыяльнага Вярхоўнага суду БССР, на жаль, ня ведаю іх прозьвішчаў, далі толькі чатыры гады, а маглі ж адваліць і дзесяць.

Многіх, вядома ж, зацікавіць, якое ж палітычнае злачынства я ўчыніў. А вось такое. Прыслаў бацька зь вёскі ліст, што ня можа разьлічыцца з падаткамі: мяса здай, малако здай, воўну здай, грошы заплаці, а на працадні які ўжо год нічога не даюць. Бацька прасіў мяне: «Можа б ты, сынок, памог мне грашыма?» Гэта ў мяне прасіў, студэнта-рабфакаўца, якому хапала стыпэндыі толькі паабедаць кожны дзень у студэнцкай сталоўцы. Тады я вёў дзёньнік, запісаў у ім пра бацькаў ліст і просьбу да мяне, і ад сябе дадаў, што ўсё гэта адбываецца пад шчасьлівым сталінскім сонцам. Адзін студэнт-стукач употай залез у мой чамадан, прачытаў дзёньнік, гэты запіс і паслаў данос у НКВД. Мяне арыштавалі, прыпісалі варожую агітацыю. За гэта «сталінскае сонца» я і паплаціўся.

Вось такая была мая таямніца, якую я старанна хаваў, у тым ліку і ад Міхаіла Абрамавіча.

Ну, а ягоная таямніца была зусім іншая, зьвязаная зь ягонай службай у тых унутраных войсках.

Прыводжу ягоны аповед пра гэту таямніцу.

— Я ня толькі вартаваў турму і канвайраваў арыштаваных, але рабіў і яшчэ нешта страшнае, — расказваў Міхаіл Абрамавіч. — Да арміі я навучыўся вадзіць аўтамабіль. І вось аднойчы мне мой начальнік гаворыць: «Шафёр спэцмашыны захварэў, трапіў у бальніцу. Пакуль хварэе ён, ты часова заменіш яго, сядзеш за руль». Я баец шараговы, загад — ёсьць загад, сеў за руль той спэцмашыны, якую ў народзе празвалі «воранам», або «хапуном». Ноччу я падганяў яе да нейкага дому, адтуль выводзілі аднаго ці некалькіх арыштаваных, саджалі ў «воран», і я адвозіў у турму, у тыя самыя падвальныя камэры, дзе ты сядзеў, або ў «амэрыканку» — круглую такую турму-вежу, збудаваную паводле амэрыканскага праекту. Аднак ня гэта самае страшнае.

Страшнае было, калі павёз ноччу ў тым «воране» людзей на расстрэл. Колькі іх набілі ў машыну, ня ведаю, але многа. Саджалі іх у машыну з завязанымі ззаду рукамі. Ехалі яны стоячы. Цяперашні парк Чалюскінцаў тады быў яшчэ звычайным лесам на ўскраіне Менску. Вось туды, у той парк, і загадалі мне ехаць. Аб'ехалі азярыну і павярнулі да ўсходняй часткі парку. Калі стаць на праспэкце тварам да парку, то гэта будзе зьлева. На палянцы спыніліся. Там ужо была выкапаная яма мэтры два на чатыры. З машын ахоўнікі пачалі выводзіць па адным і саджаць на край ямы так, каб былі спушчаныя ногі. Ахоўнікі стралялі ў патыліцу, і чалавек валіўся ў яму тварам уніз. Перад нашым прыездам там пабывала ўжо іншая машына, і яма была напоўненая высока. Калі расстралялі ўсіх з нашага «ворана», то трупаў напоўнілася на самыя краі ямы. А іх жа трэба засыпаць зямлёй, і, каб не атрымалася пагорку, здаравікі-ахоўнікі пачалі тыя трупы ўтоптваць. Утрамбоўвалі так, што ажно быў чуваць трэск касьцей. Такое ўспамінаць жахліва. Пасьля расстрэлу ахоўнікі запівалі работу.

Такіх паездак я зрабіў некалькі, і ўсё да новых ям, туды ж у парк Чалюскінцаў. Я ўжо гаварыў, што туды вазілі і іншыя «вораны», таму колькі там магіл засталося, наўрад ці можна палічыць. Многа.

Аднойчы, каб паскорыць расправу, ахоўнікі вывелі з машыны ўсіх адразу і рассадзілі па краях ямы. Ахвяры зь зьвязанымі рукамі сядзелі моўчкі. Твараў іх нельга было разгледзець у цемры. Не паверыш, ніхто не крычаў, ня плакаў, нават жанчыны, а былі і яны. Я, паставіўшы машыну, адыходзіў далей і чуў толькі стрэлы. Але двойчы прысутнічаў, і то не да канца. Гэта першы раз, і гэты раз, калі ўсіх адразу вывелі. Дык вось, сядзяць тыя няшчасныя на краі ямы, маўчаць, чакаюць. Відаць, усё ж да канца ня верылі, што на расстрэл іх прывезьлі. А выканаўцы з наганамі ззаду стаяць. А потым на загад — узмах рукі старшага — пачыналі бахаць. Некаторыя не адразу падалі ў яму, тады ў іх другі раз стралялі і штурхалі нагой уніз...

— А мог хто і незабіты ўпасьці? Паранены толькі? А потым выпаўзьці? Ноч жа цёмная, — спытаў я.

— Я чуў, што нехта выпаўз зь ямы і нават будучы засыпаным уратаваўся. Але ці праўда гэта — ня ведаю.

— Так нікога з ахвяр у твар і не запомніў? — спытаў я.

— Запомніў... І цяпер помню. Тады з турмы выехалі, калі ўжо ноч канчалася. Прыехалі ў парк, і віднець пачало. Ахоўнікі пачалі сьпяшацца, каб управіцца да сонца. Адчынілі дзьверы «ворана», скамандавалі выходзіць па адным. Я стаю, думаю, пагляджу, хто ж выйдзе, што за чалавек, а раптам які знаёмы? І што ж ты думаў? Выйшаў мой настаўнік беларускай мовы і літаратуры з Плешчаніц. Убачыў мяне, пазнаў. «Міша!» — ускрыкнуў ён, і такая надзея ўспыхнула на яго твары, так ён засьвяціўся, узрадаваўся — а можа, я і ёсьць той, хто ўратуе яго. «Міша! — паўтарыў ён, прыпыніўшыся каля мяне. — Ты тут?» Ахоўнік штурхнуў яго ў сьпіну і падвёў да ямы, загадаў сесьці, а настаўнік стаіць, на мяне глядзіць, чакае нешта ад мяне — паратунку. Я ж, як самлеў, ні паварухнуцца, ні сказаць што. Ды і што я мог зрабіць і сказаць? Ахоўнік ня стаў чакаць, калі настаўнік сядзе, ўгаворваць ня стаў больш, а стрэліў яму ў скронь. Тады я пабег, і бег доўга, сам ня ведаючы куды. Упаў, і гістэрычны плач пачаў мяне ўсяго калаціць. Чуў, што стрэлы скончыліся, што мяне гукаюць, мацюкаюцца, ехаць трэба, а я ляжу. Мяне знайшлі, далі ў карак. Дарогай старшы ахоўнік пачаў мяне суцяшаць: «Падумаеш, настаўніка сустрэў, я свайго цесьця шлёпнуў. Служба ёсьць служба. Ці ж я ведаю, каго мне прывязуць? Бацьку прывязуць, і бацьку роднага ў распыл пушчу». Больш на «воране» я ня езьдзіў.

— Адмовіўся?

— Той пастаянны кіроўца, якога я замяняў, з бальніцы вярнуўся. А я зноў стаяў на вуліцы Ўрыцкага, цябе ахоўваў.

Мы пайшлі тады ў парк Чалюскінцаў, дзе Міхаіл Абрамавіч і паказаў мне тую частку парку, дзе ў трыццатых гадах расстрэльвалі людзей. І месцы магіл прыблізна паказаў. Там стаяў нейкі бэтонны слупок, які, як казалі, азначаў, што нібыта тут расстрэльвалі нашых людзей немцы.

Цяпер ня толькі Міхаілу Абрамавічу ня хочацца заходзіць у гэты парк, але і я бываю там вельмі рэдка. Дужа ўжо няўтульна ў ім сябе адчуваю. Так і думаеш, што ступаеш па касьцях людзей, па чарапах зь дзірачкамі ў патыліцах. Страшнае гэта адчуваньне.

Спадзяюся, што пасьля Курапацкіх магіл урадавая камісія, якая там працуе, зоймецца выяўленьнем месца сталінскіх расстрэлаў і ў парку Чалюскінцаў. А Міхаіл Абрамавіч, пра якога я паведаміў сябру ўрадавай камісіі Васілю Быкаву, камісіі дапаможа.

...У дзень свайго арышту, 5-га красавіка, я заўсёды іду на вуліцу Ўрыцкага і каля кожнага замураванага акенца былой турмы кладу па дзьве кветкі ў памяць сваіх аднакамэрнікаў, якія тут пакутавалі і загінулі. Праўда, кветкам доўга паляжаць не даюць, выходзіць з дому нехта ў форме і прыбірае іх. Навошта, чаго баяцца?

І яшчэ адно. Калі гэтыя нататкі былі ўжо напісаныя, прачытаў у «Известиях» за 28 жніўня зацемку ўласнага карэспандэнта газэты М.Шыманскага «Чьи останки покоятся в лесу под Минском». М.Шыманскі як быццам сумняецца наконт таго, што «адбывалася тут у канцы 1930-х — пачатку 1940-х гг.». Што датычыць мяне, дык асабіста я ня маю ніякіх сумненьняў. Яшчэ калі сам сядзеў ва ўнутранай турме НКВД, ужо гаварылася пра Курапаты. Нават гучала час ад часу злавеснае папярэджаньне: «Адвязем цябе ў Курапаты». Здаецца, туды і павезьлі Янку Нёманскага, Юрку Лявоннага, Тодара Кляшторнага...

**Васіль Хомчанка, пісьменьнік, падпалкоўнік юстыцыі ў адстаўцы**

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,** дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Дзякуй!

**Вользе П.** з Маладэчанскага раёну.
**Віталю А.** з Слуцку.
**Ю.Б.** з Бабруйску.
**Віктару С., Уладзімеру Б.** з Ваўкавыску.
**Андрэю Ч.** з Рагачоўскага раёну.
**Барысу С.** зь Сьветлагорскага раёну.
**І.Дз.** з Гарадзенскага раёну.
**Мікалаю Ш.** з Салігорскага раёну.
**Анатолю С., Алегу К.** з Мазырскага раёну.
**Любові Ш.** зь Віцебску.
**Сяргею Ц.** з Докшыцкага раёну.
**Уладзімеру К., А.А., Ліане Ш.** зь Менскага раёну.
**Сяргею С.** з Баранавічаў.
**В.Г.** з Гомелю.
**Н.К., Ірыне Х., Івану А., Д.М., Аляксандру Б., Уладзімеру В., Вячаславу Б.** з Горадні.
**А.П.** зь Берасьця.
**Вользе З., В.Ш., Л.Р., Н.М., В.М., Аляксандру Н., Г.П., Т.М., С.А., Ю.В., Тацяне Ц., Раісе К., Пятру К., Любові С., У.З., Яўгену І., Але Р., Ільясу Х., Сьвятлане В., Адаму З., У.Б., В.С., Валянціну Д., Зьмітру С., Барысу А., Н.К., Кацярыне Дз., Валер'ю Г., Тацяне В., Вадзіму Г., Васілю З., Валянціне Л., Натальлі З., Віктару Д., В.М., Уладзімеру Р., Віктару К., Людміле Г., Эдварду К., Л.Н., Але К., Тамары М., Сьвятлане К., Вячаславу К., Л.І., Андрэю Ф., Т.П., В.Г., Андрэю Т., Паўлу Л., Ільлю Ч., Анатолю К., Жанне К., Юр'ю М., Надзеі І., Ніне Ш., Л.І., Андрэю Ф., Г.Б., Я.А., І.Н., Галіне Т., Людміле М., А.Б., Мікалаю К., Івану К., В.М., Іне К., Уладзімеру Ц.** зь Менску.

**У КРУПІЦЫ ВЫБУХАМ РАЗБУРЫЛА БУДЫНАК.** Спэцыялісты называюць здарэньне загадкавым, бо ў памяшканьні не магло быць рэчываў, якія здольныя выклікаць такую дэтанацыю. На шчасьце, ніхто зь людзей не пацярпеў. Пашкоджаныя дахі суседніх дамоў. Раней у тым будынку ў вёсцы Крупіца (Менскі раён) было прадпрыемства «Вясёлка», пасьля памяшканьні здавалі ў арэнду фірмам, што займаліся вытворчасьцю блёкаў, фасадаў. Ня мог выбухнуць і газ, бо ён ня быў падведзены.



PHOTO BYMEDIA.NET

## У Нясьвіжы гарэла ратуша

Пажар гасілі каля гадзіны. На месца здарэння прыехала ўсё кіраўніцтва горада.

Нагадаем, што ў свой час у Нясьвіжы згарэў палац, пасьля чаго пачалася яго рэканструкцыя.

## Нацбанк выпусьціў манеты «Навасельле»

Нацбанк увёў у абарачэньне памятныя манеты «Навасельле» з сэрыі «Сямейныя традыцыі славянаў».

Гэта срэбныя й медна-нікелевыя кругалякі наміналам 20 рублёў і 1 рубель адпаведна.

На пярэднім баку манэтаў у цэнтры выяўлены кот. На адваротным баку — атрыбуты дому: фрагмэнт сьцяны з вакном, над папярочкай якога закампанаваныя ключы. У ніжняй частцы манэтаў напісана: «НАВАСЕЛЛЕ».




## У Лідзе злавілі забойцаў шаптухі

Справа цягнулася яшчэ з 1988 г., калі на Ашмяншчыне была забітая сталая жанчына. Яна займалася знахарствам і да яе ішлі па дапамогу жыхары навакольных вёсак. Быў забіты і яе сабака, які замінаў шукаць грошы. Злачынцаў удалося злавіць днямі ў Лідзе. Адзін зь іх — грамадзянін Расеі, другі — жыхар Менску.

## У Менску кардэры скралі $35 тысячаў

Кардэры — гэта злодзеі, што крадуць чужыя грошы з выкарыстаньнем высокіх тэхналёгій, у тым ліку інтэрнэту і падробных банкаўскіх картак. Два менчукі, 25 і 26 гадоў, самі рабілі плястыкавыя карткі, праз якія атрымлівалі доступ да рахункаў замежных грамадзян. Падазраваных затрымалі на месцы злачынства ля банкамату «Прыёрбанку». Падчасператрусаў на здыманых кватэрах затрыманых міліцыянты знайшлі 423 падробныя карткі, 60 млн рублёў, прыстасаваньні для запісу інфармацыі на магнітную стужку банкаўскай карткі і яе чытаньня («скімэр»).

## У Серабранцы асьвяцілі нарожны камень касьцёла Сьв. Яна

21 чэрвеня у Серабранцы на будаўнічай пляцоўцы новага касьцёла адбылася сьвятая імша, якую цэлебраваў кардынал Казімір Сьвёнтэк. Пасьля ўрачыстай Літургіі ў парафію Сьвятога Яна Хрысьціцеля прыбыў Дзяржсакратар Бэнэдыкта XVI кардынал Тарчызіё Бэртонэ.

## На менскіх вуліцах за паўгоду загінула 35 чалавек

З пачатку 2008 г. у Менску адбылося 546 дарожна-транспартных здарэньняў з пацярпелымі. Загінула 35 чалавек, 590 — атрымалі раненьні. Гэта крыху меней, чым летась. Тады за аналягічны пэрыяд было зафіксавана 577 ДТЗ, у якіх 41 чалавек загінуў і 635 былі параненыя.

## У Караляўцы Беларусь прадстаўляе жыхарка ЗША

У Калінінградзкай вобласьці ідзе міжнародны конкурс для замужніх прыгажунь «Місіс сьвету — 2008». Удзельніцам давядзецца ня толькі дэфіляваць па подыюме, але і, напрыклад, спаборнічаць у кулінарным майстэрстве, а таксама удзельнічаць у спартовых і творчых конкурсах. Беларусь на «Місіс сьвету — 2008» прадстаўляе 27-гадовая Кацярына Ганага — мадэлька зь Менску, якая цяпер жыве ў Маямі (ЗША). Яна скончыла Інстытут сучасных ведаў, працавала ў мадэльным агенцтве «Тамара», была тварам кампаній Velcom, Bugalux, Milavitsa, «Сьвітанак». Кася замужам за брытанцам, у іх ёсьць двухгадовы сын.

## У Любліне пэнсіянэр узарваў мурашак

74-гадовага Марціна Барташа дасталі мурашкі, што атабарыліся ў ягонай кватэры. Ён набываў інсэктыцыды літрамі, але эфэкту гэта не давала. Тады стары выліў усе запасы атруты ў вэнтыляцыйную шахту, а ўсьлед кінуў запалены ручнік. Выбух ператварыў шматкватэрны дом у руіны. Пэнсіянэр з апёкамі трэцяй ступені трапіў у бальніцу. Суседзі не пацярпелі. Ці пацярпелі мурашкі — невядома.

## У Расеі судзілі падлеткаў, якія спалілі чалавека на Вечным агні

Злачынства адбылося паўгоду таму ў горадзе Кальчугіна (Расея). Чацьвёра п'яных падлеткаў жорстка зьбілі чалавека, які зрабіў ім заўвагу, і непрытомнага паклалі на Вечны агонь. На тыдні скончыўся суд па гэтай справе. Яны атрымалі ад дзевяці да васемнаццаці гадоў турмы.

## Алькагалізм можа перадацца ад дзеда

Апошнія дасьледаваньні паказалі, што людзі, у якіх сярод продкаў былі алькаголікі, нават у трэцім калене, маюць падвышаную рызыку разьвіцьця альказалежнасьці. Раней дасьледчыкі канцэнтравалі ўвагу на бацьках алькаголіка, зазвычай на бацьку. Аднак «існуюць і іншыя фактары, што спрыяюць разьвіцьцю алькагалізму, напрыклад, агульнае жытло, кола сяброў, узрост, у якім чалавек пачаў ужываць алькаголь, курэньне» — кажа аўтар дасьледаваньня Крыстай Капоўн з дасьледчага цэнтру па вывучэньні схільнасьці да алькаголю Ўнівэрсытэту Браўн.

Паводле статыстыкі, пад наглядам наркалягічнай службы Беларусі знаходзіцца 178 тыс. хворых на алькагалізм. Колькасьць беларусаў, што пакутуюць на альказалежнасьць, штогод расьце на 2—3 %.

## Рэмба і Тэрмінатар у індыйскім кіно

Сыльвэстар Сталонэ і Арнольд Шварцэнэгер стануць першымі амэрыканскі акторамі на здымачнай пляцоўцы індыйскай кінастудыі Балівуд. «Неверагоднае каханьне» абяцае стаць самым масавым праектам за ўсю гісторыю індыйскага кіно. На стварэньне карціны выдаткавана $22 млн. Прадусары задумалі зьняць гісторыю індуса, які спрабуе прабіцца ў Галівудзе. Аднак нягледзячы на пасьпяховую кар'еру, ён ня можа знайсьці ў Амэрыцы каханьне. Галоўныя ролі ў карціне выканаюць зоркі Балівуду — Акшай Кумар і Карына Капур. Адным з удзельнікаў праекту называюць бамбейскага міліярдэра Аніла Амбані, шостага чалавека ў сьпісе самых багатых людзей сьвету.

**Паводле АТ, naviny.by, «Эўрарадыё», catholic.by, newsru.com**

На ўшанаваньне абраза Маці Божай Будслаўскай у мястэчка Будслаў, што на рэчцы Сэрвач, у Мядзельскім раёне, штогод 1 ліпеня зьбіраюцца дзясяткі тысячаў паломнікаў з усяе Беларусі. Базыліка за 500 гадоў існаваньня столькі перажыла, што кожны год да самога сьвята ўшанаваньня Сьвятой Апякункі Беларусі дадаецца які-небудзь юбілей. Так, сёлета адзначаецца дзесяцігодзьдзе каранацыі абраза Маці Божай Будслаўскай.

# Будслаўскі фэст




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Пілігрымка

ў Будслаў пешшу пойдзе зь Менску 27 чэрвеня, а 8.00 ад Катэдры. Аўтобусная пілігрымка выпраўціца 1 ліпеня а 17-й (кошт 20.000). Каб узяць удзел у пілігрымках, трэба папярэдне запісацца праз т.: (017) 203-65-41, 226-62-44.

### Расклад урачыстасьці

**1 ліпеня**

**14.00—17.00** — сустрэча і прывітаньне пілігрымаў.

**18.00** — сьв.Імша для пілігрымаў.

**20.00** — сьв.Імша.

**21.30** — Акафіст перад абразом Маці Божай. Сьпеў — хор Грэка-каталіцкай царквы.

*Праграма паклiканьняў*

**23.00** — марыйныя Нешпары (ксяндзы салезіяне)

**24.00** — працэсія са сьвечкамі, сьв.Імша (сьпеў — хор «Залатая Горка» і парафіі Яна Хрысьціцеля ў Серабранцы).

**2 ліпеня**

**2.00** — праграма для моладзі (намётавы гарадок. Старажытныя танцы — моладзь з катэдры і гурт «Небасхіл»).

**2.00** — сьв.Імша паводле грэка-каталіцкага абраду.

**4.00** — адарацыя Найсьвяцейшага Сакрамэнту (у базыліцы).

**5.30** — гадзінкі да Маці Божай (па-польску; сьпеў — пілігрымы).

**6.00** — сьв.Імша перад абразом Маці Божай (цэлебруюць айцы бэрнардыны. Сьпеў — хор «Голас душы»).

**7.30** — сьвяты Ружанец.

**8.30** — сьв.Імша (па-польску; сьпеў — хор Polonez).

**10.00** — камэнтар.

**10.30** — сьв.Імша (сьпеў — хор Gloria).

Выстаўленьне Найсьвяцейшага Сакрамэнту, працэсія.

Te Deum laudamus.

**13.00** — сьв.Імша (па-польску).

## КАНЦЭРТЫ




### Вольскі сыграе міні-канцэрт

**26 чэрвеня ў дыскарні «Містэрыя гуку» (ГЦ «Рыга», вул.Сурганава, 50)** адбудзецца рэліз CD-вэрсіі сольнага альбому Лявона Вольскага «Куплеты і прыпевы». Таксама пройдзе аўтограф-сэсія і міні-канцэрт. **Пачатак а 18.00.**

На дыску «Куплеты і прыпевы» апрача арыгінальных дзесяці песень будуць іх караоке-вэрсіі, а таксама трэш-відэа «Эўравізія». Акрамя таго, дыск будзе мець сапраўды зьмястоўны буклет. У ім — тэксты і акорды да альбому, а таксама эксклюзіўны слоўнік, дзе Лявон Вольскі тлумачыць розныя словы і тэрміны, выкарыстаныя ў тэкстах. Сярод іх, «бадунец», «коркі», «цёркі» і шмат інш.

**Паводле music.fromby.net**

### Джаз зь Нью-Ёрку

**29 чэрвеня а 19-й ў Белдзяржфілярмоніі** — канцэрт **джаз-трыё Андрэя Кандакова**. Гэты піяніст іграў з Эды Гомесам, Лені Ўайтам і Ігарам Бутманам, стала выступае на нью-ёрскай сцэне.

### Бяседа

**26 чэрвеня ў к/з «Менск» (вул.Кастрычніцкая, 5)** — канцэрт ансамблю «Бяседа». **Пачатак а 19-й.** Квіткі: 10000—30000.

### Іранская музыка

**27 чэрвеня з Доме вэтэранаў (вул.Янкі Купалы, 21)** — вялікі канцэрт іранскай музыкі **Awindar**. Бяруць удзел **Масуд Талібані** (голас, тамбак, сэтар, даф), **Піт Паўлаў** (гітара) і інш.

### Вільня, Горадня, Менск

**28 чэрвеня ў DA Club (вул.Броўкі, 22)** — вялікі канцэрт панк-року. Удзел бяруць гурты **Lenino Prospektas** (Вільня), **Romeros** (Горадня), **Cherry Lips** (Горадня), **Bottle Suckers** (Менск), **Destroyers** (Менск), **Riot Kids** (Менск). **Пачатак а 18-й.**

### Цыганы ў Казе

**1 ліпеня ў к/з «Менск»** выступае цыганскі ансамбль **«Руска рома»** (Масква). **Пачатак а 19-й.**

### Гайдн і Шапэн у Філярмоніі

**8 ліпеня ў Малой залі Белдзяржфілярмоніі** адбудзецца канцэрт фартэпіяннай музыкі, на якім прагучаць творы Гайдна, Шапэна, Скрабіна ў выкананьні піяністкі **Маі Іргалінай**. **Пачатак а 19-й.**

### Арт-шоў «Ноч у Луцкім замку»

**29—30 чэрвеня ў Луцку (Украіна) з 21-й да 6-й гадзінаў** адбудзецца арт-шоў «Ноч у Луцкім замку», падчас якога сваё мастацтва прадэманструюць гурт сярэднявечнай музыкі **«Стары Ольса»** (Беларусь), тэатар старадаўняй музыкі **«Яварына»**, музычны гурт **«Гайдамакі»**, моладзевы тэатар **«Гармідэр»** (Луцк). На працягу ночы адбудуцца тэатралізаваныя экскурсіі па замку, фэерыя агню, прэзэнтацыя напояў і страваў Сярэднявечча.

## ІМПРЭЗЫ

### Парад нявестаў

**29 чэрвеня ў цэнтры Менску** пройдзе Парад нявестаў. Гэты фэстываль заснаваны вясельным фатографам з Масквы Кацярынай Алешынскай. Такія шоў прайшлі ўжо ў шэрагу расейскіх і ўкраінскіх гарадоў. Кабрыялеты правязуць па цэнтры сталіцы 36 маладых у вясельных строях. У парку Горкага пасьля адбудзецца канцэрт.

## ВЫСТАВЫ

### Ніко Пірасмані ў Менску

**Да 13 жніўня ў Мастацкім музэі** працуе выстава твораў грузінскага мастака Ніко Пірасмані, на якой можна будзе ўбачыць 24 працы са збораў Нацыянальнага музэю Грузіі.

### Кераміка Пабла Пікаса

**У Мастацкім музэі да 7 жніўня** працуе выстава керамікі Пабла Пікаса. У музэі захоўваюцца 38 твораў мастака, якія датуюцца 1948—1960-мі.

### Местачкоўцы на карцінах

**У малой залі Музэю сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасьці, 47) да 29 чэрвеня** працуе выстава твораў Генадзя Матусевіча «Маё Быцьцё».

Жыцьцё маленькага правінцыйнага мястэчка — галоўная тэма ў творчасьці мастака. Жыцьцё местачкоўцаў, іхны побыт, рэальнасьць — гэта існаваньне, дзе быццам бы спыніўся час.

### Наіўная алімпіяда

**Да 30 чэрвеня ў арт-галерэі «Падземка» (пр.Незалежнасьці, 43)** працуе выстава беларускай мастачкі Ані Коўшар. Яна прапанавала сваю вэрсію алімпіяды без спаборніцтваў, перамог і паразаў.

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**27 (пт)** — «Я не пакіну цябе»
**28 (сб)** — «Памінальная малітва»
**29 (ндз)** — «Маэстра»
**30 (пн), 2 (ср)** — «Сны аб Беларусі»
**6 (ндз)** — «Сымон-музыка»
**7 (пн)** — «Паўлінка»
**9 (ср), 10 (чц)** — «Пінская шляхта»
**13 (ндз)** — «Ідылія»

*малая сцэна*

**6 (ндз)** — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях»
**7 (пн)** — «Баляда пра каханьне»

### Тэатар беларускай драматургіі

**30 (пн)** — «Неба ў дыямэнтах»
**1 (аўт)** — «Містэр розыгрыш»
**7 (пн)** — «Сталіца Эраўнд»
**8 (аўт)** — «Іванаў»
**9 (ср)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**10 (чц)** — «Жан і Бэатрыса»
**11 (пт)** — «Адэль»

## КОНКУРС

### Выдавецтва «Галіяфы» запрашае маладых літаратараў

Распачынаецца літаратурны конкурс імя Паўлюка Шукайлы для моладзі. Прымаюцца празаічныя і паэтычныя творы. **Час падачы матэрыялаў — да 29 верасня 2008 г.**

**Адрас выдавецтва «Галіяфы»:** 220039, Менск, вул.Брылеўская, 11-44.

**E-mail:** vish@bk.ru.

Падрабязная інфармацыя на сайце **www.goliafy.com**.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Рэквіем па мары»

Толькі адзін сэанс у Менску!

**Рэквіем па мары** (Requiem for a Dream)

ЗША, 2000, каляровы, 102 хв.

**Рэжысэр:** Дарэн Аранофскі

**Жанр:** Драма

**Прэміі, фэсты:** Намінацыя на «Оскара» і «Залаты глёбус» за найлепшую жаночую ролю, прызы таварыства крытыкаў — усяго 20 узнагародаў і 34 намінацыі.

**Адзнака:** 9 (з 10)

Два сябры Гары (Джарэд Лета) і Тайран (Марлон Ўэйенз) — дробныя наркагандляры. Гары надакучылі крымінальныя мітрэнгі — і разам зь сяброўкай Мэрыян (Джэніфэр Канэлі) ён зьбіраецца распачаць нармальны бізнэс. Але наркотыкі пераўтвараюць жыцьцё чатырох людзей у рэквіем па апошняй мары.

Гэты фільм трэба глядзець! Стужка Дарэна Аранофскага — найважнейшая карціна 2000-х, пранізьліва-шокавая мара, загубленая гераінам і галюцынацыямі, апэратарскі цуд і трыюмф майстэрства.

«Рэквіем па мары» — найлепшы й найпапулярнейшы фільм Дарэна Аранофскага. Калі папярэдняя карціна «Пі» — гэта змрочна-выкшталцонае авангардовае трызьненьне «не для ўсіх», а наступны «Фантан» — каліграфічныя практыкаваньні ў мэдытацыі і архетыпах, то «Рэквіем па мары» — гэта пякучая гісторыя людзей, расказаная сьвежай, сучаснай мовай.

Парадаксальны мантаж, вострыя, амытыя сьлязой і болем кадры Мэцью Лібаціка — і нябёсная музыка Клінта Мэнсэла — на тле паноўнага зла.

Апэратар на фільме сапраўды плакаў — калі Элі Бёрстын вымаўляла свой маналёг пра старасьць. Акторка грае ў фільме маці Гары — яна худнее, шалее, імчыцца ў чырвонай сукенцы па вуліцы, яе паляць электрашокам, прывязваюць да ложка. Джэніфэр Канэлі ў ролі Мэрыян праходзіць пакуты, якія й ня сьніліся колішняй гераіні «Фэномэнаў»; Джарэд Лета — па кавалках губляе жыцьцё і цела.

Але самыя невыносныя кадры ў фільме служаць катарсісу.

Нельга не спачуваць героям, нельга не адчуваць болю і нельга не захлынацца Рэквіемам, калі засталіся адны толькі мары.

Толькі адзін сэанс у кінатэатры «Перамога» 26 чэрвеня а 18.00.

**Андрэй Расінскі**

# Як татальна падтрымліваць расейскую зборную

**ЛЕВЫМ ВОКАМ**



Да набору жалезных, як Маргарэт Тэтчэр, аргумэнтаў, якія гарантуюць нам вечна нізкія кошты на расейскі газ («НАТО — бяка», агульная славянская кроў, акопы Другой сусьветнай), у Берасьці дадаўся новы: «беларусы татальна падтрымлівалі расейскую зборную на Эўра'2008». Засталося толькі напоўніць тэзіс канкрэтным зьместам. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

*28.08.2008*

*10.45*

*Масква. Перад офісам «Газпрому».*

— Раз-два: «Ра-сея, ўпе-род! Нас-таў твой чэ-род!» Камякоў, ты як у трубу дудзіш? Праз пяць хвілін перамовы па газу, а ты, прабач, нейкія пукі выдаеш. Як ты зьбіраесься ўвогуле кошт $140 за тысячу кубоў утрымаць? Што? Прапануеш забацаць усёй дэлегацыяй барыню пад балалайку?! Калісьці танчыў у Доме піянэраў. Ты яшчэ прапануй перад Грэфам сцэну першага балу Наташы Растовай з «Вайны і міру» ў ролях разыграць. Не праканае, Камякоў! Зараз расейцаў можна толькі на футболе разводзіць. Так, міністры, у нас яшчэ ёсьць пяць хвілін. Паўторым крычалку. І-і-і-і: «Ра-сея, ўпе-род! Нас-таў твой чэ-род!» Ня чую трашчотак: «Але-але-але-але». Добра. Вышэй транспарант. Дзе труба? Стоп! Камякоў, блін… Што? Час ісьці. Ну, пайшлі…

*12.50*

*Масква. Офіс «Газпрому».*

— Якія 200 баксаў за тысячу кубамэтраў? Памілуйце, спадар Грэф. Мы ж у чэрвені 2008-га разам перажывалі за расейскую зборную! Мы не глядзелі, хто расеец, хто беларус. Для нас на першым месцы было толькі каб гол забілі. 200 баксаў! З вас пасьля гэтага ўвесь сьвет сьмяяцца будзе. Ладна, павышайце! Ладна! Кідайце тых, хто гніў у чэрвені 2008-га на трыбунах. Як жа так? Мы ж на Эўра татальна ад расейскай зборнай фанацелі! Глядзіце самі: «Ра-сея, ўпе-род! Нас-таў твой чэ-род! Але-але-але-але»…

*14.00*

*Масква. Офіс «Газпрому».*

— Ра-сея, ўпе-род! Нас-таў твой чэ-род! Ра-сея, ўпе-род! Нас-таў твой чэ-род! Але-але-але-але. Ра-сея, ўпе-род! Нас-таў твой чэ-род! Але-але-але-але. Дарэчы, ты за каго балееш, Грэф? За Расею? А вось мы зараз праверым. У якім месцы на полі на 28-й хвіліне ў матчы з Грэцыяй быў Аршанін? Што маўчыш? Хлопцы, гэты перац, здаецца, зь іншай фірмы! Зуб даю, што ён за туркаў! Мачы яго, пацаны! На! На! Вось табе за Расею! Камякоў, што стаіш? Дай яму трубою. Во так. Што? Ахоўнікі? Шухер! Цякайма, хлопцы! Пашанцавала табе, турак.

*20.00*

*У цягніку Масква—Менск.*

— М-да, крыху не дацiснулі... Але чоткі атрымаўся выезд! І нікуды Грэф ад нас ня дзенецца. Наступны раз пасьля Алімпіяды паедзем. А ну, пацаны, давайце нашу крычалку: «Ра-сея, ўпе-род! Нас-таў твой чэ-род! Але-але-але-але»…

# Легенда зь пяску

**Выходнымі ў менскай Кунцаўшчыне, пад гарою, на якой паўстане храм Сьвятога Яна Эвангеліста, прайшоў пленэр «Легенда зь пяску». Моладзь пад кіраўніцтвам мастака Гэніка Лойкі стварыла з гліны скульптуру «Малітва сьвятога Яна Эвангеліста».**



Наступны нумар «Нашай Нівы» выйдзе 10 ліпеня, у чацьвер.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Глыбокае Лідзкага п. Віленск. г.** «У халодную яго!» 4 наябра ў нашай Дубіцкай воласьці такая была гісторыя. Адзін хлапец Г. з в.Мацюкоў стаў на прызыў, але яго не забралі, бо меў льготу 1-га разраду. Вось ён прыйшоў у воласьць, каб узяць новы ўжо пашпарт, бо выбіраўся ў прочы на заработкі. Пісар вызьверыўся на яго і гукнуў: «Ты пашпарту не дастанеш!» Хлапец спужаўся, але праз колькі мінут асьмеліўся і пытае: «Чаму я не магу дастаць пашпарту? Я маю на гэта права!» Тут старшына закрычаў: «Завядзіце яго ў халодную!» Хлапца беднага схапілі і пасадзілі ў халодную. Праз паўгадзіны быў прыказ выпусьціць. Тут толькі хлапец зразумеў, што насуха пашпарту не даюць. Мусіў паставіць у карчме 2 бутэлькі гарэлкі і закуску «начальству», і тады выдалі пашпарт.

Беларусы-мужыкі самі вінаваты, што на іх кожны, хто толькі хоча, конна езьдзіць. Каб гэта быў, напрыклад, латыш, то ніякаму старшыні і ў галаву не прыйшло б такую зь ім штуку зрабіць.

**Свой Сусед.**

**«Наша Ніва». №24. 1908**




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Дэталі — **старонка 13.**

«Нашу Ніву» пытайцеся на сядзібе ТБМ кожны будні дзень ад 15.00 да 19.00

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная.

Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз тэл.:
(017) 284-73-29,
(029) 260-78-32,
(029) 618-54-84

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### БЕЛАРУСКАМОЎНЫЯ ГРУПЫ

**Студэнты** Гарадзенскага мэдунівэрсытэту распачалі кампанію па фармаваньні беларускамоўных груп. Заклікаем усіх, хто ўжо зьяўляецца студэнтам, альбо яшчэ абітурыент, і жадае навучацца на роднай мове, пісаць ліст са сваімі дадзенымі на скрыню pikulus@tut.by

### ЖЫТЛО

**Дзьве дзяўчыны** (доктар і перакладчыца з ангельскай і нямецкай) жадаюць здымаць жытло (адна- ці двухпакаёвую кватэру) на доўгі час у Менску. Разгледзім усе варыянты і прапановы. Тэлефануйце, калі ласка, (029) 733-25-30 (Кася), (029) 625-82-96 (Надзея)

### ПРАЦА

**Капітальны рэмонт** энцыкляпэдый, слоўнікаў і падобных выданьняў. З рэстаўрацыяй або поўнай заменай пераплёту і залатым цісьненьнем. Т.: (209) 396-17-20

**Шукаю падпрацоўкі**, зьвязаныя з беларускай мовай (кампутарны набор, пераклад, рэдагаваньне). Т.: (029) 198-32-51

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101-03-24. Юрась

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101-03-24. Юрась

### КНІГІ

**Прапануем** «Незалежная прэса»: Быкаў, Барадулін, Бураўкін, Арлоў, Кіпель, Конан, Гарэцкі, Разанаў, Брыль інш. «Гоман» розныя выпускі, сотні аўтараў, у т.л. тэксты на тарашкевіцы, літаратурная вучоба. Дапаможам падрыхтаваць тэксты розных жанраў, пераклад, віншавальныя вершы, рэдактура, выданьні. Т.: (029) 753-91-96, alesknigi@mail.ru

**Шукаем кнігі**, матэрыялы па гісторыі: Сярэднявечча, ВАВ, Напалеонаўскі пэрыяд, Урбан «Старажытныя ліцьвіны». Т.: (029) 753-91-96

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 25.06.2008.

Замова № 3396.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.